Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

СУБОТА
14 СТУДЗЕНЯ 1933 г.
№ 12 (3668)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 789
Адказн. сакратар 4-79
Сакратароў . . . 6-15
Начная рэдакцыя (два нумары) 12-65
Выдавецтва . . 2-44

АЎТАМАТЫ:
Адк. рэдактар . 20-831
Адк. сакратар . 22-161
Сэкцыры . . . 22-160
Кантора . . . 22-158

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і пітаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБЪЯВЫ: радок помпарыі 1 руб. 50 к.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ: аб згубе 1 дакумэнту 2 руб.

Сеньня у нумары

Вынікі першай пяцігодкі і народна-гаспадарчы плян 1933 году—першага году другой пяцігодкі. Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) па дакладу тав. Кагановіча, ухваленая 11 студзеня 1933 году (2 стар.).
БУЛЬБАЗАГАТОЎКІ: Максымальна ўзьняць тэмпы (3 стар.).
ЛЁНАЗАГАТОЎКІ: Бязьлітасна змагацца з усялякімі спробамі паслабіць лёназагатоўкі (3 стар.).
ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ (3 стар.)
ЗА ГРАНІЦАЙ (4 стар.).
Справа работнікаў Белдзяржснабу (4 стар).

Вынікі першай пяцігодкі і народна-гаспадарчы плян 1933 году—першага году другой пяцігодкі

Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) па дакладах т. т. СТАЛІНА, МОЛАТАВА І КУЙБЫШАВА, прынятая 10 студзеня 1933 году

I. Вынікі першай пяцігодкі

У выніку ніўхільнага правядзеньня палітыкі індустрыялізацыі і разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі з посьпехам выканала асноўную задачу пяцігодкі—стварэньне ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. У абстаноўцы развалу эканомікі капіталістычных краін, пры нябывалым росьце ў гэтых краінах беспрацоўя, галечы, голаду, выканань не пяцігодкі ў СССР не за пяць, а за чатыры гады (дакладней, за чатыры гады і тры месяцы), ёсьць факт найбольш выдатны ў сучаснай гісторыі.

I. Узрастаючы пад'ём прамысловасьці ў СССР пры наяўнасьці крызісу і заняпаду прамысловасьці ў капіталістычных краінах

За пэрыяд першай пяцігодкі створана ўласная індустрыяльная база рэканструкцыі прамысловасьці, транспарту і сельскай гаспадаркі.

З адсталай, дробна-сялянскай краіны, якой была старая Расія, СССР высунуўся ў першыя рады найбольш разьвітых у тэхніка-эканамічных адносінах краін.

Вырасьлі гіганты чорнай і каляровай мэталюргіі, хіміі, энэргетыкі—Магнітабуд, Кузьнецкбуд, Уральскі медны камбінат, Рыдлераўскі палімэталічны камбінат, Волхаўскі алюміньевы камбінат, Чорнарэчанскі і Беразьніковіцкі азотныя заводы, Дняпрабуд, Зуеўская, Чалябінская і Штэйнфэльдская электрастанцыі, магутныя шахты ў Данбасе, Кузбасе і інш. раёнах, буйныя крэкінгавыя заводы, коксавыя ўстаноўкі і г. д., рэканструяваны амаль усе буйныя прадпрыемствы гэтых галін прамысловасьці.

Вырасьлі гіганты машынабудаўніцтва:

Трактарабудаўніцтва, якое можа забясьпечваць сельскую гаспадарку штогод мільёнамі конскіх сіл—Сталінградзкі і Харкаўскі трактарныя заводы, Путылаўскі трактарны, які зараз ператвараецца ў завод дёгкавых аўтамабіляў, Чалябінскі завод магутных вусенічных трактараў, які хутка ўступае ў строй; выраб складаных сельскагаспадарчых машын: камбайнаў, складаных малатарань, культыватараў пікераў, ільнаперабілак, Ростсельмаш, Саратаўскі камбайнавы завод, «Камунар» у Запарожжы, «Серп і молат» у Харкаве, Любярэцкі завод і г. д.

Аўтамабільная прамысловасьць, кожны з заводаў якой здольны штогод выпускаць больш таго, што назапасіла за дзесяткі год царская Расія шляхам імпарту і ўласнага вырабу,—завод імя Сталіна ў Маскве, Горкаўскі завод імя Молатава, Яраслаўскі завод цяжкіх грузавікоў.

Выраб магутных паравозаў і вагонаў: паравозныя заводы—новы Луганскі, рэканструяваны Каломенскі завод вагона-будаўнічыя заводы — Нижня-Тагільскі, які будуецца, рэканструяваныя імя «Правды», Калінінскі і г. д.

Выраб буйных турбін і генэратараў для электрастанцый: Электрасіла, мэталёвы завод імя Сталіна ў Ленінградзе, Турбабуд у Харкаве.

Выраб абсталяваньня для ападавай прамысловасьці: магутных урубавых машын, сьвідравальных машын для вугалю і нафты, крэкінгаў, трубчатак, магутных лябёдак і г. д. Горлаўскі завод, Сібмашбуд, Падольскі крэкінгавы завод, завод імя лейтэнанта Шмідта ў Баку і інш.

Самалёта і авіяматорабудаўніцтва—заводы ў Маскве, Горкім, Варонежы, Сібіры і г. д.

Складанае варштатабудаўніцтва і выраб інструментаў—заводы ў Маскве, у г. Горкім, Ленінградзе і г. д.

У выніку бурнага машынабудаўніцтва ў цэлым вырасла ў параўнаньні з 1927-28 годам у 4-5 раз (з перавышэньнем намячэньняў апошняга году пяцігодкі на 54 проц.), а ў параўнаньні з даваенным часам машынабудаўніцтва павялічылася ў 10 раз.

Пабудавана новая вугальна-мэталюргічная база — Урал-Кузбас. У выніку ўсяго гэтага:

а) Карэнным чынам зьмяніліся суадносіны прамысловай і сельска-гаспадарчай прадукцыі ў карысьць першай, бо ўдзельная вага прамысловасьці вырасла з 48 проц. у 1927-28 г. да 70 пр. у 1932 г., пры нязьменным росьце сельскай гаспадаркі, а ў самой прамысловай прадукцыі выраб сродкаў вытворчасьці атрымаў пераважаючы характар, бо ўдзельная вага прадукцыі цяжкай індустрыі вырасла з 44,5 проц. у 1927-28 г. да 53 проц. у 1932 г., што перавысіла заданьне пяцігодкі на 10 проц.

б) Аб'ём прамысловай прадукцыі ў 1932 годзе вырас у параўнаньні з даваенным узроўнем да 334 проц. і ў параўнаньні з 1928 годам—да 219 пр., замест запраектаванага пяцігодкай для апошняга пятага году пяцігодкі росту ў параўнаньні з узроўнем 1928 г. у 234 проц., што вызначыла выкананьне ў чацьвертым годзе пяцігодкі (1932 г.) на 93,7 проц. ад праграмы пятага году пяцігодавага пляну, а выкананьне пяцігодкі па цяжкай прамысловасьці на 108 проц., пры гэтым ход выканаьня пяцігодкі ішоў побач са штогодным ростам прадукцыі па ўсёй прамысловасьці ў сярэднім на 22 проц.

в) Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць склалі за чатыры гады і 3 месяцы, 23,3 млрд. рублёў, замест намечаных пяцігодкай 18,8 млрд. рублёў за пяць год, што складае 124 проц. супроць пяцігадовага пляну, а па ўзгадненай сельскай гаспадарцы капітальныя ўкладаньні за чатыры гады і тры месяцы склалі 9,4 млрд. рублёў замест 7,2 млрд. рублёў, намечаных пяцігодкай на пяць год, што складае 130 проц. супроць пяцігадовага пляну.

г) Прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці за чатыры гады вырасла на 38 проц., што некалькі адстае ад заданьня пяцігодкі.

Такім чынам СССР з краіны аграрнай ператварыўся ў краіну індустрыяльную, што ўмацавала эканамічную незалежнасьць краіны, бо СССР атрымаў магчымасьць рашаючую частку неабходнага абсталяваньня вырабляць на сваіх уласных прадпрыемствах.

Зусім іншы малюнак прадстаўляе становішча прамысловасьці ў капіталістычных краінах. Пры грандыёзным росьце прамысловасьці ў СССР у капіталістычных краінах мае месца жорсткі крызіс і катастрафічнае зьніжэньне прамысловай вытворчасьці. У ПАЗШ прамысловая вытворчасьць упала ў параўнаньні з вытворчасьцю 1928 году на 44 проц., у Германіі—на 45 проц., ва Францыі—на 25 проц., у Англіі—на 20 проц., у Польшчы—на 46 проц. Гэта акалічнасьць адкінула ўзровень вытворчасьці ў капіталістычных краінах на 3-4 дзесяцігодзьдзі назад. У рэзультаце крызісу ў капіталістычных краінах адбываецца значнае амярцьвеньне вытворчага апарату (не загрузка і зькрыцьцё прадпрыемстваў). Так, напрыклад, у Германіі амярцьвеньне апарату цяжкай індустрыі склала 65 проц., у ПАЗШ—85 проц. зьніжэньне прадукцыйных сіл і матэрыяльных каштоўнасьцей, крах раду канцэрнаў, развал і дэмаралізацыя на «лепшых» да гэтага часу прадпрыемствах капіталізму (Форд) ідзе поўным ходам.

Такі вынік разьвіцьця капіталізму за апошнія чатыры гады.

2. Узрастаючы пад'ём сельскай гаспадаркі ў СССР пры наяўнасьці крызісу і заняпаду сельскай гаспадаркі ў капіталістычных краінах

Шпаркі рост індустрыі, з аднаго боку, і посьпяховае правядзеньне палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы—з другога далі магчымасьць забясьпечыць сельскую гаспадарку трактарамі і навейшымі сельска-гаспадарчымі машынамі, аб'яднаць дробныя аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў буйныя калектыўныя гаспадаркі і арганізаваць шырокую сетку збожжавых і жывёлагадоўчых савецкіх гаспадарак.

За пэрыяд пяцігодкі здана сельскай гаспадарцы:

а) Больш 120 тысяч новых трактараў, магутнасьцю ў 1.900 тыс. сіл;

б) на 1.600 млн. рублёў сельскагаспадарчых машын, што больш чым падвоіла машынную ўзброенасьць сельскай гаспадаркі ў параўнаньні з 1928 г., асабліва маючы на ўвазе рэзкае павялічэньне сучасных складаных машын трактарнай цягі.

За апошнія чатыры гады арганізавана 2.416 машынна-трактарных станцый, забясьпечаных сучаснымі прыладамі працы, майстэрнямі для рамонту, аўтамабілямі і г. д.

За апошнія 3 гады арганізавана звыш 200 тыс. калектыўных гаспадарак з ахватам калтасамі звыш 60 проц. сялянскіх гаспадарак і каля 75 проц. усіх сялянскіх пасеўных плошчаў.

За той жа пэрыяд арганізавана 5.000 савецкіх гаспадарак (збожжавых, жывёлагадоўчых і тэхнічных культур), прычым калтасы разам з савецкімі гаспадаркамі ахапляюць каля 80 проц. усіх пасеўных плошчаў.

У рэзультаце ўсяго гэтага:

а) разгромлена кулацтва, падарваны карэньні капіталізму ў сельскай гаспадарцы і тым самым забясьпечана перамога сацыялізму ў вёсцы, а калгасная гаспадарка ператварылася ў моцную апору сацыялістычнага будаўніцтва;

б) вырашана гістарычная задача пераводу дробнай і індывідуальнай, раздробленай сялянскай гаспадаркі на рэйкі сацыялістычнага буйнага земляробства, і СССР з краіны дробнатаварнай прадукцыі ў карысьць першай, бо ўдзельная вага прамысловасьці вырасла з 48 проц. у 1927-28 г. да 70 пр. у 1932 г., пры нязьменным росьце сельскай гаспадаркі, а ў самой прамысловай прадукцыі выраб сродкаў вытворчасьці атрымаў пераважаючы характар, бо ўдзельная вага прадукцыі цяжкай індустрыі вырасла з 44,5 проц. у 1927-28 г. да 53 проц. у 1932 г., што перавысіла заданьне пяцігодкі на 10 проц.

б) Аб'ём прамысловай прадукцыі ў 1932 годзе вырас у параўнаньні з даваенным узроўнем да 334 проц. і ў параўнаньні з 1928 годам—да 219 пр., замест запраектаванага пяцігодкай для апошняга пятага году пяцігодкі росту ў параўнаньні з узроўнем 1928 г. у 234 проц., што вызначыла выкананьне ў чацьвертым годзе пяцігодкі (1932 г.) на 93,7 проц. ад праграмы пятага году пяцігадовага пляну, а выкананьне пяцігодкі па цяжкай прамысловасьці на 108 проц., пры гэтым ход выканаьня пяцігодкі ішоў побач са штогодным ростам прадукцыі па ўсёй прамысловасьці ў сярэднім на 22 проц.

в) Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць склалі за чатыры гады і 3 месяцы, 23,3 млрд. рублёў, замест намечаных пяцігодкай 18,8 млрд. рублёў за пяць год, што складае 124 проц. супроць пяцігадовага пляну, а па ўзгадненай сельскай гаспадарцы капітальныя ўкладаньні за чатыры гады і тры месяцы склалі 9,4 млрд. рублёў замест 7,2 млрд. рублёў, намечаных пяцігодкай на пяць год, што складае 130 проц. супроць пяцігадовага пляну.

г) Прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці за чатыры гады вырасла на 38 проц., што некалькі адстае ад заданьня пяцігодкі.

Такім чынам СССР з краіны аграрнай ператварыўся ў краіну індустрыяльную, што ўмацавала эканамічную незалежнасьць краіны, бо СССР атрымаў магчымасьць рашаючую частку неабходнага абсталяваньня вырабляць на сваіх уласных прадпрыемствах.

Зусім іншы малюнак прадстаўляе становішча прамысловасьці ў капіталістычных краінах. Пры грандыёзным росьце прамысловасьці ў СССР у капіталістычных краінах мае месца жорсткі крызіс і катастрафічнае зьніжэньне прамысловай вытворчасьці. У ПАЗШ прамысловая вытворчасьць упала ў параўнаньні з вытворчасьцю 1928 году на 44 проц., у Германіі—на 45 проц., ва Францыі—на 25 проц., у Англіі—на 20 проц., у Польшчы—на 46 проц. Гэта акалічнасьць адкінула ўзровень вытворчасьці ў капіталістычных краінах на 3-4 дзесяцігодзьдзі назад. У рэзультаце крызісу ў капіталістычных краінах адбываецца значнае амярцьвеньне вытворчага апарату (не загрузка і зькрыцьцё прадпрыемстваў). Так, напрыклад, у Германіі амярцьвеньне апарату цяжкай індустрыі склала 65 проц., у ПАЗШ—85 проц. зьніжэньне прадукцыйных сіл і матэрыяльных каштоўнасьцей, крах раду канцэрнаў, развал і дэмаралізацыя на «лепшых» да гэтага часу прадпрыемствах капіталізму (Форд) ідзе поўным ходам.

Такі вынік разьвіцьця капіталізму за апошнія чатыры гады.

3. Рост таваразвароту паміж горадам і вёскай у СССР і разгортваньне савецкага гандлю пры наяўнасьці крызісу і заняпаду гандлю ў капіталістычных краінах

Посьпех індустрыялізацыі і рост калгаснага будаўніцтва ўмацавалі вытворчую змычку рабочай клясы з калгасным сялянствам і канчаткова ўмацавалі яе ў якасьці асноўнай формы змычкі гораду і вёскі. Гэтай рашаючай акалічнасьці не зразумелі праваапартуністычныя элемэнты ў партыі. Але толькі безнадзейныя «левакі» могуць лічыць, што тым самым ужо зьнімаецца пытаньне аб умацаваньні гандлёвай формы змычкі гораду і вёскі і недаацэньваць гаспадарчага і палітычнага значэньня далейшага пашырэньня вырабу тавараў шырокага ўжытку, усямернага павялічэньня іх рыначных фондаў і разгортваньня таваразвароту для ўзмацненьня забесьпячэньня прамтаварамі рабочых і калгасных мас.

Абсалютная перавага сацыялістычных элемэнтаў у народнай гаспадарцы, выцясьненьне з гандлю прыватна-капіталістычных элемэнтаў і ўмацаваньне вытворчай змычкі падняслі гандлёвую форму змычкі на новую, больш высокую ступень, на такую ступень савецкага гандлю, калі забясьпечана як у горадзе, так і ў вёсцы пануючае становішча дзяржаўна-каапэрацыйнага, а таксама калгаснага гандлю і вядзецца сыстематычная барацьба за выкараненьне спэкуляцыі ў гандлі.

У выніку пяцігодкі мы маем:

а) павялічэньне прадукцыі лёгкай прамысловасьці, якая ўзьнялася да 187 проц. у параўнаньні з 1928 годам;

б) рост раздробнага каапэрацыйна-дзяржаўнага таваразвароту, які складае зараз у цэнах 1932 г. 39,9 млрд. руб., г. зн. павялічэньне таварнай масы ў разробным гандлі да 175 проц. ад 1928 году;

в) рост дзяржаўна-каапэрацыйнай гандлёвай сеткі на 158 тысяч крам і магазынаў у адносінах да 1929 году;

г) разгортваньне калгаснага гандлю, якое ўсё павялічваецца, і сельска-гаспадарчых загатовак асобных дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый.

Зусім іншы малюнак прадстаўляе становішча таваразвароту ўнутры капіталістычных краін, дзе крызіс прывёў да катастрафічнага скарачэньня гандлю, масавага закрыцьця прадпрыемстваў і руйнаваньня дробных і сярэдніх гандляроў, банкрутства буйных гандлёвых фірм і затаварваньня гандлёвых прадпрыемстваў пры бязупынным паданьні пакупнай здольнасьці працоўных мас.

4. Зьніжэньне беспрацоўя і рост жыцьцёвага ўзроўню працоўных у СССР пры наяўнасьці нябывалага росту беспрацоўя і зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню працоўных у капіталістычных краінах

Ніўхільны пад'ём прамысловасьці і сельскай гаспадаркі ў СССР акрэсьлілі два асноўныя факты, якія карэнным чынам палепшылі матар'яльнае становішча працоўных:

1. Зьніжэньне беспрацоўя і ліквідацыя ніўпэўненасьці ў заўтрашнім дні сярод рабочых.

2. Ахват калгасным будаўніцтвам амаль усёй беднаты, падарыў на гэтай аснове распластаваньня сялянства на заможных і незаможных і зьніжэньне ў сувязі з гэтым зьбядненьня і паўпэрызму на вёсцы, у выніку гэтых асноўных заваяваньняў у галіне паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочых і сялян мы маем за першую пяцігодку:

а) рост колькасьці рабочых і служачых буйнай прамысловасьці ўдвая ў параўнаньні з 1928 годам, што дае перавыкананьне пяцігадовага пляну на 57 проц.;

б) рост народнага даходу, у тым ліку даходаў рабочых і сялян, які дасягнуў у 1932 г. 45,1 млрд. рублёў, што дае павялічэньне на 85 проц. у параўнаньні з 1928 годам;

в) рост сярэднягадовай заработнай платы рабочых і служачых буйнай прамысловасьці на 67 проц. у параўнаньні з 1928 г., што дае перавыкананьне пяцігодкі на 18 проц.;

г) рост фонду сацыяльнага страхаваньня на 292 проц. у параўнаньні з 1928 годам (4.120 млн. руб. у 1932 г. супроць 1.050 млн. руб. у 1928 г.), што дае перавыкананьне пяцігадовага пляну на 111 проц.

д) рост грамадзкага харчаваньня з ахопам звыш 70 проц. рабочых рашаючых галін прамысловасьці, што дае перавыкананьне пяцігодкі ў шэсьць раз;

е) пераход прамысловасьці на 7-гадзінны рабочы дзень з ахопам пераважаючай большасьці рабочае клясы.

Зусім іншы малюнак прадстаўляе становішча рабочых і сялян у капіталістычных краінах.

Катастрафічна ўзрасла колькасьць беспрацоўных. У ПАЗШ, паводле афіцыяльных даных, па аднэй толькі апрацоўчай прамысловасьці колькасьць занятых рабочых зьменшылася з 8,5 млн. чалавек у 1928 г. да 5,5 млн. у 1932 г. Паводле-ж даных амэрыканскай фэдэрацыі працы, колькасьць беспрацоўных у ПАЗШ ва ўсёй прамысловасьці даходзіць да канца 1932 г. да 12 млн. чалавек. У Англіі колькасьць беспрацоўных, паводле даных афіцыяльнай статыстыкі, узрасла з 1.290 тыс. у 1928 г. да 2,8 млн. чалавек у 1932 г. У Германіі, паводле афіцыяльных даных, колькасьць беспрацоўных узрасла з 1.375 тыс. у 1928 г. да 5,5 млн. у 1932 годзе.

Такі-ж малюнак назіраецца ва ўсіх капіталістычных краінах, прычым паводле выразна пераўменшаных даных міжнароднага бюро працы пры Лізе нацый, колькасьць беспрацоўных у капіталістычных краінах (без Кітаю, Індыі, Індаэзіі, Карэі) перавысіла ўжо 30 млн. чалавек.

Сыстэматычна праводзіцца зьніжэньне заработнай платы рабочых. Паводле афіцыяльных даных, зьніжэньне сярэднямесячнай зарплаты ў ПАЗШ дасягнула 35 проц. у параўнаньні з узроўнем 1928 г., у Англіі за тойжа тэрмін—15 проц., а ў Германіі—нават 50 проц.

Значна скарочаны і без таго нізначныя фонды страхаваньня рабочых у Англіі і Германіі. У ПАЗШ і ва Францыі зусім адсутнічаюць, або амаль адсутнічаюць якія-б там ні было формы страхаваньня беспрацоўных, з прычыны чаго вялізарна расьце колькасьць бяздомных рабочых і бяспрытульных дзяцей, асабліва ў ПАЗШ.

Ня лепш стаіць справа са становішчам сялянскіх мас у капіталістычных краінах. Сельска-гаспадарчы крызіс у корані падрывае сялянскую гаспадарку і пускае мільёны зруйнаваных сялян і фэрмэраў жабраваць. Даволі ўказаць, што ў ПАЗШ, паводле афіцыяльных даных, гадавы даход сярэдняга фэрмэра зьменшыўся за апошнія тры гады з 847 даляраў у 1929 г. да 187 даляраў у 1932 годзе.

5. Пашырэньне культурнай базы і рост тэхнічных кадраў у СССР пры наяўнасьці заняпаду і распыленьня тэхнічных кадраў у капіталістычных краінах

Рост народнай гаспадаркі і ўздым дабрабыту працоўных мас суправаджаліся адначасовым значным пашырэньнем культурнай базы і шпаркім ростам тэхнічных кадраў у СССР.

Колькасьць вучняў у пачатковых школах па СССР павялічылася з 10 млн. у 1928 г. да 19 млн. у 1932 годзе. Канчаецца правядзеньне пачатковага абавязковага навучаньня. Пісьменнасьць насельніцтва ўзьнялася з 67% у 1930 г. да 90 проц. у 1932 годзе.

Колькасьць вучняў у агульна-адукацыйных сярэдніх школах узьнялася з 1.600 тыс. у 1928 г. да 4.350 тыс. у 1932 г. Колькасьць вучняў у тэхнікумах і рабфаках павялічылася з 264 т. чалавек у 1928 г. да 1.437 тыс. чалавек у 1932 г. Колькасьць вучняў у вышэйшых навучальных установах павялічылася з 166 тыс. чалавек у 1928 г. да 500 тыс. чалавек у 1932 г.

Вырасла колькасьць навукова-дасьледчых інстытутаў з 1.224 у 1929 г. да 7.700 у 1932 г., а колькасьць навуковых работнікаў павялічылася ў два разы.

У той-жа час у капіталістычных краінах закрываюцца вышэйшыя навучальныя ўстановы і навуковыя інстытуты, расьце беспрацоўе тэхнічных кадраў і дэкваліфікацыя іх, большасьць канчаючых ВНУ ня маюць магчымасьці на толькі працаваць па спэцыяльнасьці, але наогул знайсьці сабе работу. З прычыны гэтага зьмяншаецца прыцёк студэнтаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы, мае месца вымушаная трата капіталам сваіх камандных кадраў (Форд), усё большае пашырэньне атрымліваюць «тэорыі» непатрэбнасьці прагрэсу навукі і тэхнікі і нагляднейшая дэградацыя навуковае мысьлі.

6. Капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі разьбіты, фундамант сацыялістычнай эканомікі пабудован, перамога сацыялізму ў СССР забясьпечана

Пераможнага завяршэньня пяцігодкі за чатыры гады рабочая кляса СССР дасягнула пад кіраўніцтвам партыі ў непахіснай барацьбе з клясавым ворагам, прыдушаючы малейшае яго супраціўленьне. На аснове росту сацыялістычнай індустрыі, разгортваньня сацыяльнай калектывізацыі ў асноўных вёсковых раёнах і пераходу да палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы вырашана асноўнае пытаньне «хто кого», вырашана ў карысьць сацыялізму, супроць капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі.

Пераможнага завяршэньня пяцігодкі за чатыры гады партыя дасягнула ў барацьбе за няўхільнае і пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі, у барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, у барацьбе з «лявацкімі» перагібамі і з контр-рэвалюцыйным трацкізмам, шляхам бязьлітаснага разгрому ўсякага роду антысацыялістычных груповак, шляхам рашучага выкрыцьця агентаў клясавага ворага з партбілетам у кішэні з ліку буржуазных перараджэнцаў.

Пераможнага завяршэньня пяцігодкі партыя дасягнула на аснове няўхільнага росту творчай актыўнасьці і ініцыятывы шырокіх мас, на аснове ўцягненьня ўсё большай колькасьці рабочых і калгасьнікаў у рады ўдарнікаў сацыялістычнай будоўлі, на аснове разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва.

Аднак, у поўнай сіле захоўвае сваё значэньне ўказаньне ХУII канфэрэнцыі на тое, што пасьпяховасьць сацыялістычнага наступленьня нямінуча выклікае ў новых формах абвастрэньне клясавай барацьбы ў паасобных раёнах і на паасобных участках сацыялістычнай будоўлі.

7. Ад першай пяцігодкі да другой пяцігодкі

Першая пяцігодка была пяцігодкай будаўніцтва новых заводаў, якія прадстаўляюць новую тэхнічную базу прамысловасьці для рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі, пяцігодкай будаўніцтва новых прадпрыемстваў, у земляробстве—калгасаў і саўгасаў, якія прадстаўляюць вагар для арганізацыі ўсяе сельскае гаспадаркі на пачатках сацыялізму.

Адсюль ухіл у бок новага будаўніцтва, пафос новага будаўніцтва, як першая характарная рыса пэрыяду першай пяцігодкі.

Але будаўніцтва новых прадпрыемстваў у галіне прамысловасьці таксама як і ў галіне сельскай гаспадаркі, праходзіла, галоўным чынам, за кошт скарыстаньня ўжо існуючых, старых або абноўленых прадпрыемстваў прамысловасьці, тэхніка якіх ужо асвоена і скарыстаньне якіх не прадстаўляла асаблівай труднасьці. Адсюль вялізарная ўдзельная вага старых і абноўленых прадпрыемстваў прамысловасьці ў справе вырабу гатовай прадукцыі і магчымасьць больш паскораных тэмпаў росту прамысловай прадукцыі, як другая характарная рыса пэрыяду першай пяцігодкі.

Інакш будзе стаяць справа з другой пяцігодкай. У адрозьненьне ад першай пяцігодкі другая пяцігодка будзе пераважна пяцігодкай асваеньня новых прадпрыемстваў у прамысловасьці, пяцігодкай арганізацыйнага ўмацаваньня новых прадпрыемстваў, у сельскай гаспадарцы калгасаў і саўгасаў, што, зразумела, не выключае, а мае на мэце далейшае разьвіцьцё новага будаўніцтва. Гэта значыць, што другая пяцігодка, калі яна хоча разьлічваць на сур'ёзны посьпех, павінна дапоўніць цяперашні лёзунг новага будаўніцтва новым лёзунгам асваеньня новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі. Але асваеньне новых прадпрыемстваў і новай тэхнікі прадстаўляе значна больш труднасьцяй, чым скарыстаньне старых або абноўленых заводаў і фабрык, тэхніка якіх ужо асвоена. Яно патрабуе больш часу для таго, каб падняць кваліфікацыю рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу і набыць новыя навыкі для поўнага скарыстаньня новай тэхнікі.

З гэтага вынікае, што ў пэрыяд другой пяцігодкі пераважаючая роля ў галіне росту прамысловай прадукцыі будзе належаць ужо не старым прадпрыемствам, а новым, тэхніку якіх трэба яшчэ асвоіць, што ня можа не пацягнуць за сабой некаторага зьмяншэньня тэмпаў росту прамысловай прадукцыі ў параўнаньні з тэмпамі першай пяцігодкі. Адсюль неабходнасьць менш паскораных тэмпаў росту прамысловай прадукцыі ў пэрыяд другой пяцігодкі, прынамсі, для першых двух або трох год другой пяцігодкі.

У сувязі з гэтым аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК лічыць, што:

а) Сярэдня-гадавы прырост прамысловай прадукцыі для другой пяцігодкі павінен быць запраектаваны не ў 21—22 проц., як гэта мела месца ў першай пяцігодкі, а некалькі менш, прыкладна ў 13—14 проц.

б) Галоўны упор павінен быць зроблен не на колькасны рост прадукцыі, а на паляпшэньне якасьці прадукцыі і рост прадукцыйнасьці працы ў прамысловасьці; не на пашырэньне посьпяўных плошчаў, а на рост ураджайнасьці ў земляробстве і паляпшэньне якасьці работы ў сельскай гаспадарцы.

II. Народна-гаспадарчы плян першага году другой пяцігодкі (1933 г.)

Вынікі першай пяцігодкі ствараюць поўную магчымасьць далейшага значнага разьвіцьця народнай гаспадаркі ў 1933 г.—першым годзе другой пяцігодкі.

Выходзячы з гэтага, аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе:

1. Вызначыць прырост прадукцыі прамысловасьці ў 1933 г. у 16,5 проц. у адносінах да 1932 году, у тым ліку па групе «А» ў 21,2 проц., а па групе «Б» у 10,5 проц.

2. Устанавіць наступны разьмер абавязковых вытворчых заданьняў па важнейшых галінах прамысловасьці:

а) па выпрацоўцы электраэнэргіі—16.300 млн. кват гадзін;

б) па чорнай мэталюргіі—9 млн. тон чыгуну;

в) вугалю—84 млн. тон, нафце—24,4 млн. тон;

г) машынабудаўніцтве—6,5 млрд. р. (у цэнах 1926—27 г.);

д) па хімічнай прамысловасьці—1839 млн. руб. (у цэнах 1926—27 г.);

е) па лёгкай прамысловасьці—8,8 млрд. руб. (па цэнах 1926—27 г.);

ж) па харчовай прамысловасьці (Нарпрамснаб і Камзаг СПА)—7,7 млрд. руб. (па цэнах 1926—27 г.);

з) па лясной прамысловасьці Наркамлесу 2072 млн. руб. (па цэнах 1926—27 г.);

і) па прамказапэрацыі—7920 млн. руб. (у плянавых цэнах 1932 г.).

3. Па сельскай гаспадарцы. Устанавіць для 1933 г. разьмер веснавой пасеўнай плошчы ў 95 млн. га і азімых збожжавых у 38,5 млн. га, у тым ліку:

па збожжавых яравых—63,1 млн. га, пры сярэднім ураджаі ўсіх збожжавых у 8 цэнтнэраў з га;

па бавоўне—2,067 млн. га, пры сярэднім ураджаі абвадняемай бавоўны ў 8 цэнт. з га;

па буракох—1,2 млн. га, пры сярэднім ураджаі ў 100 цэнт. з га;

па ільну—2,3 млн. га, пры сярэднім ураджаі ў 2,4 цэнт. з га.

Давесьці колькасьць МТС да 2.768.

Давесьці колькасьць галоў жывёлы ў дзяржаўных жывёлагадоўчых аб'яднаньнях і ў калгасных фэрмах:

па буйнай рагатай жывёле: саўгасы—2550 тыс. штук, таварныя фэрмы—да 6.000 тыс. штук;

па каровах: саўгасы—да 1162 тыс. штук, таварныя фэрмы—да 2500 тыс. штук; па сьвіньнях: саўгасы—да 1 млн. 100 тыс. штук, таварныя фэрмы—да 3750 тыс. штук;

па авечках: саўгасы—да 4840 тыс. шт., таварныя фэрмы—да 6205 тыс. штук.

4. Устанавіць для 1933 г. разьмер грузазвароту па чыгунках у 300 млн. тон і разьмер штодзённай пагрузкі ў колькасьці 68 тыс. вагонаў.

5. У адпаведнасьці з разьмерамі вытворчых заданьняў па прамысловасьці, транспарту і сельскай гаспадарцы вызначыць капітальныя ўкладаньні ў народную гаспадарку на 1933 г. ў суме 18 млрд. рублёў, з іх:

а) у прамысловасьць—10.109 млн. р. (супроць 9.164 млн. руб. мінулага году), у тым ліку: па групе «А»—6.527 млн. руб., па групе «Б»—1.582 млн. руб.;

б) у транспарт—2.976 млн. руб.;

в) у сельскую гаспадарку—2.148 млн. руб.

6. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК лічыць адзай з важнейшых задач плану 1933 году мэханізацыю працёмкіх работ (тэхнічныя культуры ў сельскай гаспадарцы, вугаль, лес, торф, пагрузачна-разгрузачныя работы і г. д.). Пленум ЦК і ЦКК прапануе СНК СССР і ўсім партыйным і савецкім арганізацыям пастаянна назіраць за поўным выкананьнем прадугледжаных плянаў мэханізацыі і вырабу адпаведнага абсталяваньня.

7. У частцы прадукцыйнасьці працы і зьніжэньня сабекошту ўстанавіць на 1933 год параўнальна з 1932 г.

а) Рост прадукцыйнасьці працы па прамысловасьці на 14 проц.;

б) Зьніжэньне сабекошту ў прамысловасьці на 3,5 проц.;

в) Зьніжэньне сабекошту будаўніцтва на 15 проц.

Надаючы вялізарнае значэньне барацьбе за якасныя паказальнікі, усякае недавыкананьне якіх стварае прарывы ў справе накапленьня і кладзецца цяжарам на дзяржаўным бюджэце, і ад значаючы, што ў мінулым годзе мела месца ў некаторых галінах невыкананьне заданьняў па якасных паказальніках, а часамі і пагаршэньне становішча параўнальна з мінулым годам, аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК прапануе ўсім гаспадарчым, партыйным і прафэсыянальным арганізацыям сканцэнтраваць у 1933 годзе галоўную ўвагу на поўным выкананьні заданьняў па ўздыме прадукцыйнасьці працы і зьніжэньні сабекошту, ступень ажыцьцяўленьня якіх будзе ў першую чаргу ўлічвацца пры ацэнцы дзейнасьці кожнага прадпрыемства і трэсту.

8. У мэтах далейшага росту матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных, аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе:

а) вызначыць разьмер капітальных укладаньняў у камунальную гаспадарку ў суме 696 млн. руб. і ў жыльлёвае будаўніцтва 1.472 млн. руб.;

б) устанавіць агульны аб'ём затрат на абслугоўваньне сацыяльна-культурных патрэб працоўных (сакстрах, асьвета, аховы здароўя, адлічэньні ад прыбыткаў на культурнае і жыльлёвае бу

Працяг на другой старонцы.

Мэты і задачы палітычных аддзелаў МТС і саўгасаў

Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) па дакладу тав. КАГАНОВІЧА, ухваленая 11 студзеня 1933 г.

I. Слабасьць палітычнай работы ў вёсцы і неабходнасьць стварэньня палітаддзелаў МТС і саўгасаў

Барацьба за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі і завяршэньне ня сацыялістычнай перабудовы зьяўляецца ў цяперашні момант важнейшай задачай партыі.

Калектывізацыя асноўных мас бядняцка серадняцкага сялянства, пашырэньне вытворча-тэхнічнай базы калгасаў і разьвіцьцё саўгаснага будаўніцтва стварылі неабходныя прадпасылкі для далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі, умацаваньня харчовай і сыравой базы індустрыялізацыі і бязупыннага росту даходаў як калгасаў, так і паасобных калгасьнікаў.

Пасьпяховаму вырашэньню гэтых задач аказваюць жорсткае супраціўленьне антысавецкія элемэнты вёскі. Гаспадарча разьбіты, але яшчэ ня страціўшы канчаткова свайго ўплыву кулак, былыя белыя афіцэры, былыя папы, іх сыны, былыя ўпраўляючыя памешчыкаў і цукразаводчыкаў, былыя ўраднікі і іншыя антысавецкія элемэнты з буржуазна-нацыяналістычнай і ў тым ліку эсэраўскай і пятлюраўскай інтэлігенцыі, якія аселі на вёсцы, усяляк стараюцца разбурыць калгасы, стараюцца сарваць мерапрыемствы партыі і ўраду ў галіне сельскай гаспадаркі, выкарыстоўваючы ў гэтых мэтах несьвядомасьць часткі калгасьнікаў—супроць інтарэсаў грамадзкай калгаснай гаспадаркі, супроць інтарэсаў калгасага сялянства.

Пралазячы ў калгасы ў якасьці рахункаводаў, загадчыкаў гаспадаркі, кладаўшчыкоў, брыгадзіраў і г. д., а часта і ў якасьці кіруючых работнікаў праўленьняў калгасаў, антысавецкія элемэнты імкнуцца арганізаваць шкодніцтва, псуюць машыны, сеюць з агрэхамі, раскрадаюць калгаснае дабро, падрываюць працоўную дысцыпліну, арганізуюць пакражы насеньня, патайныя сьвірны, сабатаж збожжазагатовак, а іншы раз удаецца ім разбурыць калгасы.

Пралазячы ў саўгасы ў якасьці загадчыкаў гаспадарак, бухгальтароў, паляводаў, кладаўшчыкоў, кіраўнікоў вддзяленьняў і інш., гэтыя антысавецкія элемэнты шкодзяць саўгаснаму будаўніцтву наўмысным паломкай трактараў, камбайнаў, дрэннай апрацоўкай зямлі, дрэнным доглядам жывёлы, разважэньнем працоўнай дысцыпліны, разлажэньнем працоўнай дысцыпліны, асабліва яго прадукцыі (збожжа, мяса, малако, масла, воўны і г.д.).

Усе гэтыя антысавецкія і антыкалгасныя элемэнты прасьледуюць адну агульную мэту: яны дабіваюцца аднаўленьня ўлады памешчыкаў і кулакоў над працоўнымі сялянамі, яны дабіваюцца аднаўленьня ўлады фабрыкантаў і заводчыкаў над рабочымі.

Ад камуністаў і спачуваючых ім беспартыйных патрабуецца асаблівая пільнасьць для таго, каб арганізаваць адпор гэтым супрацьнародным элемэнтам і разграміць іх да шчэнту.

Між тым, сельскія партыйныя і камсамольскія арганізацыі, у тым ліку ячэйкі ў саўгасах МТС, пазбаўленыя вельмі часта рэвалюцыйнага пачуцьця і пільнасьці у радзе месц ня толькі не процістаяць гэтай антысавецкай рабоце варожых элемэнтаў клясавую пільнасьць і бальшавіцкую штодзённую барацьбу за ўзмацненьне савецкага ўплыву на шырокія беспартыйныя масы калгасьнікаў і работнікаў саўгасаў, але іншы раз самі падпадаюць пад уплыў гэтых шкодніцкіх элемэнтаў, а некаторыя члены партыі, пралезшыя ў партыю з-за кар'ерысцкіх мэтаў, змыкаюцца з ворагамі калгасаў, саўгасаў і савецкай улады і арганізуюць разам з імі пакражы насеньня ў часе сяўбы, пакражу збожжа ў часе ўборкі і абмалоту, хаваньне збожжа ў патайных сьвірнях, сабатаж збожжазагатовак і, значыць, уцягваюць паасобныя калгасы, групы калгасьнікаў і адсталых работнікаў саўгасаў у барацьбу супроць савецкай улады.

Гэта асабліва адносіцца да саўгасаў, дзе ня рэдка дырэктары саўгасаў пад уплывам антысавецкіх элемэнтаў падпадаюць буржуазнаму перараджэньню, сабатуюць заданьні савецкай улады, ідуць на простае ашуканства партыі і ўраду і прабуюць распараджацца дзяржаўнай саўгаснай прадукцыяй, як сваёй асабістай уласнасьцю. У сувязі з гэтым перад вясковымі камуністамі і камсамольцамі стаіць зараз задачы арганізацыі і ўзначаленьня ў калгасах і саўгасах сапраўднага партыйнага і савецкага актыву; задачы за ваяваньня большасьці ў калгасах і саўгасах і выгнаньня з калгасаў і саўгасаў пралезшых туды антысавецкіх элемэнтаў, у першую чаргу з радоў загадчыкаў гаспадарак, рахункаводаў, бухгальтараў і кладаўшчыкоў; задачы барацьбы за настойлівае, пасьлядоўнае прыстасаваньне законаў савецкай улады ад адміністрацыйных і карных мерах супроць арганізатараў раскрадваньня калгаснай і саўгаснай маемасьці і сабатажу мерапрыемстваў партыі і ўраду па лініі збору насеньня і сяўбы, уборкі і абмалоту, выкананьня пляну збожжазагатовак і мясазагатовак і г. д.

Галоўнейшым вагаром перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад і бязупыннага ўзмацненьня савецкага ўплыву на калгасьнікаў зьяўляюцца машына-трактарныя станцыі і саўгасы, як буйнейшыя фабрыкі сацыялістычнага земляробства.

Машына-трактарныя станцыі і саўгасы заваявалі сабе моцнае месца ў сацыялістычнай сельскай гаспадарцы ў якасьці арганізатараў сыстэмы аграмаджанай гаспадаркі. Аднак, ня гледзячы на буйнейшую арганізацыйна-гаспадарчую ролю ў ўплыў МТС у справе тэхнічнага пераўзбраеньня і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, іх ПАЛІТЫЧНЫ ўплыў на шырокія масы калгасьнікаў пакуль яшчэ зусім невыстарчальны. МТС вельмі часта ня маюць палітычнага твару. Унутры МТС часта-густа квітнеюць злачынна-нядбайныя адносіны да заданьняў партыі і ўраду, злачынныя адносіны да дзяржаўнай маемасьці, злодзейства і раскрадваньне калгаснай маемасьці і дзяржаўнай уласнасьці. Клясава-варожыя элемэнты ня рэдка пралазяць і ў самыя МТС, вядуць сярэдзіну работу па ўзмацненьні антысавецкага ўплыву на калгасьнікаў.

Гэта ў значнай меры адносіцца і да саўгасаў. Ня гледзячы на перадавую ролю саўгасаў у справе тэхнічнага пераўзбраеньня і сацыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі, да гэтага часу іх палітычны і гаспадарчы ўплыў на калгасы яшчэ невыстарчальны. Замест узорнай работы па аўладаньні і скарыстаньні тэхнічнага ўзбраеньня саўгасаў і паказу на практыцы пераваг буйнага сельска-гаспадарчага прадпрыемства перад дробнай, індывідуальнай гаспадаркай, у саўгасах праяўляюцца часамі буржуазныя тэндэнцыі, квітнеюць злачынна-нагардлівыя адносіны да дзяржаўнай маемасьці, барбарскія адносіны да трактароў, аўтамашын, камбайнаў і жывёлы, раскрадваецца і разбазаравецца прадукцыя саўгасаў, ня выконваюцца заданьні партыі па здачы дзяржаве прадукцыі.

У мэтах палітычнага ўмацаваньня МТС і саўгасаў, павышэньня палітычнай ролі і ўплыву МТС і саўгасаў на вёсцы і рашучага паляпшэньня палітычнай і гаспадарчай работы нашых ячэек у калгасах і саўгасах, ЦК УсеКП(б) пастанавіў арганізаваць ва ўсіх машына-трактарных станцыях і саўгасах ПАЛІТАДДЗЕЛЫ, на чале з намесьнікамі дырэктароў МТС і саўгасаў па палітычнай частцы, якія зьяўляюцца разам з тым начальнікамі палітаддзелаў МТС і саўгасаў.

II. Задачы палітаддзелаў МТС і саўгасаў

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны разгортваньнем масава-палітычнай работы ў калгасах і саўгасах, з аднаго боку, і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў і саўгасаў—з другога, дапаўняць гаспадарча-тэхнічную работу МТС і саўгасаў па вырашэньні пастаўленых перад калгасамі і саўгасамі задач у галіне павышэньня ўраджайнасьці палёў, лепшага догляду жывёлы, сваячасовай арганізацыі асеньняй і веснавой сяўбы, сваячасовай арганізацыі ўборкі і абмалоту, сваячасовага і поўнага выкананьня калгасьнікамі і саўгасамі ўсіх сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны забясьпечыць партыйнае вока і кантроль па ўсіх галінах работы і жыцьця як саміх МТС і саўгасаў, так і калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС. Забясьпячэньне якасьці насеньня ў пэрыяд сяўбы, папярэджаньне раскрадваньня насеньня, нагляд за правільным выкананьнем абмалоту, барацьба з раскрадваньнем абмалочанага збожжа, барацьба з нявыхадамі на работу, забясьпячэньне ўважлівага догляду за жывым і мёртвым інвэнтаром калгасу і саўгасу, выгнаньне з калгасаў усіх шкодніцкіх супроцьсавецкіх і супроцькалгасных элемэнтаў, падбор лепшых праверэных кадраў для калгасаў і саўгасаў, усё гэтыя і падобныя да іх пытаньні павінны стаяць у цэнтры ўвагі палітычных аддзелаў.

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны забясьпечыць палітычны кантроль і нагляд за расстаноўкай і скарыстаньнем калгасьнікаў і работнікаў саўгасаў, памятаючы пры гэтым, што ад таго, хто працуе на сяўарцы, на малатарні, у аддзяленьні жывёлагадоўчага саўгасу, на ўліку збожжа і ўсёй калгаснай і саўгаснай маемасьці,—залежыць захаванасьць грамадзкай калгаснай і саўгаснай уласнасьці,—залежаць посьпехі калгасаў і саўгасаў.

Першачарговай задачай палітычных аддзелаў МТС зьяўляецца забясьпячэньне бязумоўнага і сваячасовага выкананьня КАЛГАСАМІ І КАЛГАСЬНІКАМІ сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай, і асабліва рашучая барацьба з раскрадваньнем калгаснай маемасьці, барацьба са зьявішчамі сабатажу мерапрыемстваў партыі і ўраду ў галіне збожжазагатовак і мясазагатовак у калгасах.

Першачарговай задачай палітаддзелаў САЎГАСАЎ зьяўляецца забясьпячэньне бязумоўнага і сваячасовага выкананьня саўгасамі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай і асабліва рашучая барацьба са спробамі паасобных дырэктароў і іх намесьнікаў прошіпаставіць свае вузкія інтарэсы саўгасу агульным інтарэсам дзяржавы, з праяўленьнем утойваньня лішкаў прадукцыі замест здачы яе дзяржаве.

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны забясьпечыць настойлівае, правільнае і сваячасовае дастасаваньне законаў савецкага ўраду аб адміністрацыйных і карных мерах у адносінах да арганізатараў раскрадваньня грамадзкай уласнасьці і сабатажу мерапрыемстваў партыі і ўраду ў галіне сельскай гаспадаркі.

Аб усіх гэтых карных мерах, у тым ліку аб судовых пастановах па выдзэйуказаных злачынствах, палітычныя аддзелы павінны даводзіць да шырокіх калгасных мас і работнікаў саўгасаў, разгортваючы вакол і на аснове падобных фактаў шырокую масава-растлумачальную і выхаваўчую работу сярод калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

Усе гэтыя задачы палітаддзелы МТС і саўгасаў павінны ажыцьцяўляць шляхам разгортваньня арганізацыйна-партыйнай і палітычна-выхаваўчай работы сярод членаў партыі і камсамолу ў саўгасах і МТС і калгасах, якія ёю абслугоўваюцца, шляхам астаноўкі масавай, палітычнай работы сярод калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, шляхам правільнага падбору і расстаноўкі партыйных і камсамольскіх сіл калгасаў і саўгасаў і беспартыйнага адданага калгаснай справе актыву, шляхам штодзённага вывучэньня калгасных кадраў і вылучэньня на адказныя рашаючыя вучасткі вытворчасьці найбольш перадавых, бязумоўна адданых актывістаў—калгасьнікаў.

Ускрываючы факты шкодніцкай работы тых ці іншых рахункаводаў і загадчыкаў гаспадаркі ў калгасах, вырываючы буржуазныя тэндэнцыі ў саўгасах, выкрываючы падкулачнікаў і арганізатараў раскрадваньня ў калгасах з радоў тых ці іншых членаў праўленьня калгасаў, вяючы рашучую барацьбу супроць раскрадвальнікаў калгаснай і саўгаснай уласнасьці, рвачоў, лодыраў, супроць цеахайных і нядобрасумленых адносін да жывога і мёртвага інвэнтару калгасу і саўгасу,—палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны на канкрэтных фактах штодзённай работы і жыцьця калгасаў і саўгасаў арганізаваць шырокія масы калгасьнікаў і работнікаў саўгасаў на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і саўгасаў, за захаванасьць і недатыкальнасьць грамадзкай калгаснай і саўгаснай уласнасьці, за рост даходаў калгасаў і калгасьнікаў, за сваячасовае і поўнае выкананьне калгасьнікамі і саўгасамі ўсіх сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны папярэджваць і весьці барацьбу супроць парушэньняў і скажэньняў пастаноў партыі і ўраду, супроць прыстасаваньня мэтаддзе голага націску і адміністраваньня, памятуючы, што вырашэньне вышэйпакаданых задач магчыма толькі пры ўмове ўсямернага паляпшэньня і ўмацаваньня арганізацыйна-гаспадарчага кіраўніцтва, прыстасаваньня ўсіх вагароў пралетарскай дыктатуры супроць кулака і яго агентуры ў калгасах і саўгасах, разгортваньня шырокай палітыка-выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў.

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў ні ў якім выпадку не павінны падмяняць у сваёй рабоце дырэктара МТС і саўгасу, памятуючы, што гаспадарчае кіраўніцтва станцыяй і саўгасам ажыцьцяўляецца дырэктарам МТС і саўгасу на прынцыпах адзінаначаньня, і што палітаддзелы павінны сваёй масава-палітычна, арганізацыйна-партыйнай і выхаваўчай работай дапамагаць вырашэньню задач, якія стаяць перад дырэктарам саўгасу і МТС.

Першая задача палітаддзелу і яго начальніка ў даны момант—згуртаваць партыйны і камсамольскі актыў унутры МТС і калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС, таксама як і ў саўгасах і іх аддзяленьнях, ня гонячыся за колькасьцю членаў, зварачаючы галоўную ўвагу на іх якасьць, на іх адданасьць партыі і ўменьне весьці за сабой калгасьнікаў і работнікаў саўгасу.

Другая задача, якая павінна вырашацца ў непарыўнай сувязі з першай—згуртаваць беспартыйны актыў вакол партыйна-камсамольскіх ячэек, зусім не адгароджваючыся ад беспартыйных калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, а наадварот, устанаўліваючы з імі сувязь і адносіны супрацоўніцтва і дабіцца таго, каб калгасы, усе без выключэньня саўгасы—сталі па сваім кіраўніцтве бальшавікімі.

Палітаддзелі і партыйцы і камсамольцы, якімі ён кіруе на вёсцы, павінны ўсяляк прыцягваць лепшых беспартыйных калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, дапускаць іх на адкрытыя сходы ячэек, асьвечваць іх палітычна на канкрэтных пытаньнях калгаснага і саўгаснага будаўніцтва і стварыць такім чынам згуртаванае ядро партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных калгасьнікаў і рабочых унутры кожнага калгасу і саўгасу для барацьбы са шкодніцкімі, антыграмадзкімі і антыкалгаснымі элемэнтамі калгасаў і саўгасаў.

Партыйцы камсамольцы не павінны баяцца барацьбы ўнутры калгасу і саўгасу за ізаляцыю і выгнаньне антыграмадзкіх, антыкалгасных элемэнтаў, памылкова мяркуючы, што такая барацьба можа парушыць адзінства калгасу або саўгасу. Нам патрэбна ня ўсякае адзінства. Нам патрэбна такое адзінства ў калгасе або саўгасе, якое забясьпечвае кіраўніцтва і ўзначальваньне бальшавіцкага ядра, якое падтрымлівае беспартыйны актыў. А такога адзінства немагчыма дабіцца без сур'ёзнай барацьбы за выгнаньне антыграмадзкіх і антыкалгасных элемэнтаў з калгасаў і саўгасаў. Таму барацьба партыйна камсамольскага ядра за стварэньне беспартыйнага актыву ў калгасах і выгнаньне антыграмадзкіх элемэнтаў для заваёвы большасьці ўнутры калгасаў і саўгасаў зьяўляецца самай істотнейшай задачай у даны момант.

Раённыя і сельскія камуністы павінны ўлічыць, што нашы калгасы і саўгасы зьяўляюцца маладымі, яшчэ не ўмацаванымі гаспадарчымі арганізацыямі, што яны перажываюць у нас у сваім арганізацыйным будаўніцтве прыблізна такі-ж пэрыяд, які перажывалі нашы фабрыкі і заводы ў 1920-21 гг., калі гэтыя апошнія былі яшчэ не ўмацаваны.

За якія-небудзь тры гады мы здолелі стварыць звыш 200 тыс. калгасаў і 5.000 саўгасаў, г. зн. стварылі зусім новыя прадпрыемствы, якія маюць для сельскай гаспадаркі такое-ж значэньне, як заводы і фабрыкі для прамысловасьці.

Гісторыя ня ведае другой такой краіны, якая змагла-б за тры гады стварыць ня толькі 205.000, але хаця-б 25.000 новых буйных прадпрыемстваў узброеных новай тэхнікай. Толькі СССР, толькі наша савецкая краіна здолела ажыцьцявіць гэта дзіва творчай работы. Таму было-б сьмешна пагрэбчаць, каб усе гэтыя шматлікія новыя буйныя прадпрыемствы ў галіне сельскай гаспадаркі створаныя на ўмовах культурнай і тэхнічнай адсталасьці рэскі, сталі адразу за адзін год узорнымі і высокарэнтабэльнымі. Неабходны відавочна час, неабходна ня стомная цярплівая, крапатлівая работа па арганізацыйным умацаваньні калгасаў і саўгасаў, па выгнаньні адтуль шкодніцкіх элемэнтаў, па дакладным падборы і выхаваньні новых праверэных бальшавіцкіх кадраў, каб калгасы і саўгасы сталі сапраўды ўзорнымі. І яны бязумоўна стануць узорнымі таксама, як сталі ўзорнымі многія нашы фабрыкі і заводы, якія ў 1920-21 гадох зьяўляліся неналаджанымі і слаба арганізаванымі.

Што датычыць зьявішчаў шкодніцтва і сабатажу ў калгасах і саўгасах, дык яны павінны адыграць урэшце такую-ж спрыяючую ролю ў справе арганізацыі новых бальшавіцкіх кадраў для калгасаў і саўгасаў, якую адыгралі шкодніцтва і «шахцінскі працэс» у галіне прамысловасьці.

«Шахцінскі працэс» паслужыў паваротным пунктам у справе ўзмацненьня рэвалюцыйнай пільнасьці камуністаў і арганізацыі чырвоных спэцыялістаў у галіне прамысловасьці. Няма падстаў сумнявацца ў тым, што зьявішчы шкодніцтва і сабатажу ў некаторых калгасах і саўгасах, якія праявіліся ў бягучым годзе, паслужаць такім-жа паваротным пунктам у справе разгортваньня рэвалюцыйнай пільнасьці нашых сельскіх і раённых камітэтаў і падбору новых бальшавіцкіх кадраў для калгасаў і саўгасаў.

І гэта адбудзецца тым хутчэй, чым хутчэй МТС і саўгасы ператворацца ў цэнтры шырокай ПАЛІТЫЧНАЙ І АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ работы ў вёсцы.

Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны такім чынам забясьпечыць ператварэньне машына - трактарных станцый і саўгасаў, якія зьяўляюцца ў цяперашні момант пераважна гаспадарча - тэхнічнымі цэнтрамі на вёсцы, у цэнтры як гаспадарча - тэхнічнага, так і ПАЛІТЫЧНАГА І АРГАНІЗАЦЫЙНАГА кіраўніцтва і ўплыву на шырокія масы калгасьнікаў.

Уся масава - палітычная, арганізацыйна - партыйная і выхаваўчая работа палітычных аддзелаў МТС і саўгасаў павінна быць накіравана да таго, каб канчаткова паралізаваць уплыў клясавага ворага ў калгасе і саўгасе і дабіцца перамаганьня дробнабуржуазных перажыткаў і ўласьніцкіх тэндэнцый учарашняга аднаасобніка - ўласьніка, сёньняшняга калгасьніка.

Палітычныя аддзелы саўгасаў і МТС павінны ўвязаць усю штодзённую работу як саміх станцый, так і калгасаў, якія імі абслугоўваюцца, з агульнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва шляхам разгортваньня арганізацыйна - партыйнай работы і ленінскага выхаваньня членаў партыі і камсамола і пастаноўкі шырокай масавай прапаганды сярод беспартыйных калгасьнікаў мерапрыемстваў партыі і ўраду ў галіне тэхнічнага пераўзбраеньня і ўздыму сельскай гаспадаркі ў галіне індустрыялізацыі краіны і павышэньня яе абароназдольнасьці, ў галіне паляпшэньня матар'яльна - бытавых умоў жыцьця рабочых, Чырвонай армії і калгасьнікаў.

Важнейшым стрыжнем усёй палітыка - растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і рабочых саўгасаў павінна быць шырокая папулярызацыя мерапрыемстваў партыі і ўраду па барацьбе за недатыкальнасьць грамадзкай калгаснай і саўгаснай уласнасьці.

Трэба растлумачыць членам партыі і камсамолу і шырокім масам калгасьнікаў і рабочым саўгасу, што гэтыя мерапрыемствы накіраваны супроць лодыраў, рвачоў, зладзеяў, якія зьяўляюцца агентамі клясавага ворага, зьяўляюцца ворагамі рабочых і калгасьнікаў.

Палітычныя аддзелы павінны мець на ўвазе, што забясьпечыць моцны палітычны ўплыў на калгасьнікаў і проціпаставіць гэты ўплыў прошукам антысавецкіх элемэнтаў можна толькі пры тэй умове, калі партыйныя і камсамольскія арганізацыі калгасаў будуць ідэйна зьнітаваныя, палітычна падкаваныя і аўтарытэтныя ў шырокай масе калгасьнікаў. Палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў павінны выкрываць і выганяць з партыйных і камсамольскіх арганізацый апартуністычныя элемэнты і агентаў клясавых ворагаў, якія пралезьлі ў арганізацыю і видуць сваю падрыўную работу пад прыкрыцьцём партыйнага або камсамольскага білету.

Палітычныя аддзелы павінны разгарнуць марксыцка - ленінскае выхаваньне членаў партыі і камсамолу на вёсцы, сыстэматычна ачышчаць партыйныя і камсамольскія арганізацыі калгасаў і саўгасаў ад няўстойлівых кар'ерысцкіх элемэнтаў і элемэнтаў, якія раздажыліся і змыкаюцца з клясавым ворагам, весьці рашучую барацьбу супроць спроб самазамыканьня партыйных і камсамольскіх арганізацый, ідэйна зьнітаваць арганізацыю на барацьбе за палітычны, бальшавіцкі ўплыў і кіраўніцтва шырокай беспартыйнай масай калгасьнікаў і рабочых саўгасаў.

Важнейшай першачарговай задачай палітычных аддзелаў МТС і саўгасаў зьяўляецца згуртаваньне вакол палітаддзелу моцнага ядра з сапраўдных актывістаў калгасных і саўгасных ячэек і стварэньне вакол гэтых ячэек беспартыйнага актыву з адданых, праверэных у барацьбе за савецкую ўладу калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. ЦК яшчэ раз падкрэсьлівае, што ў гэтай рабоце ня трэба гнацца за колькасьцю; невялікае, але палітычна падкаванае і моцна зьнітаванае барацьбой ядро заўсёды здолее павесьці за сабой усю масу калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. Разгортваючы выхаваўчую і растлумачальную работу ў калгасных ячэйках і сярод беспартыйных калгасьнікаў, палітаддзелы павінны ў першую чаргу забясьпечаць палітычны рост актыву.

Палітычныя аддзелы павінны забясьпечыць здаровы рост партыйных і камсамольскіх арганізацый за кошт сапраўды перадавых і актыўных калгасьнікаў, праверэных у барацьбе з кулаком і яго агентурай у калгасах. Палітаддзелы павінны пры гэтым выходзіць з таго, што выканаць сваю ролю [illegible] ядра на вёсцы і весьці за сабой калгасныя масы партыйныя і камсамольскія арганізацыі могуць толькі пры тэй умове, калі яны складаюцца, няхай з невялікай колькасьці, але бязумоўна адданых справе партыі бальшавікоў, ідэйна зьнітаваных і загартаваных у барацьбе з клясавым ворагам.

Выконваючы гэтыя задачы, палітычныя аддзелы МТС і саўгасаў не павінны падмяняць сабой мясцовыя раённыя партыйныя камітэты, вядучы сваю работу ў поўным кантакце з імі. Разам з тым раённыя партыйныя камітэты павінны ўсвоіць, што стварэньнем палітычных аддзелаў МТС і саўгасаў яны зусім не вызваляюцца ад задач і адказнасьці, ускладзеных на іх партыяй.

III. Палажэньне аб палітаддзелах МТС

а) Палітаддзелы МТС.

Палітаддзелы МТС арганізуюцца ў кожнай машына - трактарнай станцыі ў складзе начальніка, двух яго намесьнікаў па агульна - партыйнай рабоце і аднаго памочніка па камсамольскай рабоце. Начальнік палітаддзелу МТС адначасова зьяўляецца намесьнікам дырэктара МТС па палітрабоце.

Начальнік палітаддзелу МТС ажыцьцяўляе поўнасьцю кіраўніцтва партыйнай і камсамольскай работай і нясе поўную адказнасьць за выкананьне выдатных і загатоўчых плянаў МТС.

Палітаддзелы МТС у раёне дзейнасьці машына - трактарных станцый адказваюць штодзённую сыстэматычную дапамогу калгасным партыйным і камсамольскім ячэйкам, інструктуюць іх, правяраюць іх работу, праводзячы гэтую сваю дзейнасьць у кантакце з мясцовым райкомам партыі.

Палітаддзел МТС прымае актыўны ўдзел у падборцы кадраў МТС, і праўленьняў, і служачых калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС, маючы на ўвазе як кіруючы склад, так і адміністрацыйна - гаспадарчых работнікаў (загадчык гаспадаркі, заг. сьвірнам, рахункавод і г. д.). Начальнік палітаддзелу МТС падпарадкуецца непасрэдна палітсэктару МТС краявога (абласнога) земкіраўніцтва, і НКЗ нацрэспублікі і ня се адказнасьць перад ім у сваёй рабоце.

Разам з тым ён увязвае сваю работу з мясцовым райкомам партыі шляхам: а) уваходжэньня начальніка палітаддзелу ў склад раённага партыйнага камітэту; б) пэрыядычнай інфармацыі райкому аб рабоце палітаддзела.

Начальнікі палітаддзелаў МТС назначаюцца і зьнімаюцца цэнтральным камітэтам УсеКП(б) па прадстаўленьні першых сакратароў крайкомаў, абкомаў і ЦК нацкампартый.

б) Палітсэктар МТС краявых (абласных) земкіраўніцтваў і наркамземаў нацыянальных рэспублік. У краявых (абласных) зямельных кіраўніцтвах і наркамземах нацрэспублік арганізуюцца палітсэктары МТС у складзе: начальніка палітсэктару, двух намесьнікаў па агульна - партыйнай рабоце і аднаго памочніка па камсамольскай рабоце і адказных інструктароў па галінавых краявых трактарацэнтрах.

Начальнік краявога (абласнога, рэспубліканскага) палітсэктару МТС зьяўляецца намесьнікам загадчыка краявога (абласнога) зямельнага кіраўніцтва. Начальнік палітсэктару МТС краяв-зу непасрэдна падпарадкуецца паліткіраўніцтву МТС, Наркамзему Саюзу, узгадняе і ўвязвае сваю работу з адпаведнымі краявымі і абласнымі камітэтамі і ЦК нацкампартый, пэрыядычна робіць справаздачу перад імі аб сваёй рабоце і ўваходзіць у склад гэтых камітэтаў.

Начальнікі палітсэктараў МТС, краявых, абласных ЗУ і наркамземаў нацыянальных рэспублік зацьвярджаюцца і зьмяшчаюцца цэнтральным Камітэтам УсеКП(б) па прадстаўленьні першых сакратароў крайкомаў, абкомаў і ЦК нацкампартый.

в) ПАЛІТКІРАЎНІЦТВА МТС НАРКАМЗЕМА САЮЗУ.

У Наркамземе СССР арганізуецца палітКіраўніцтва МТС у складзе: начальніка, двух яго намесьнікаў па агульнапартыйнай рабоце і аднаго памочніка па камсамольскай рабоце і адказных інструктароў па абласных галінавых трактарацэнтрах.

Начальнік палітКіраўніцтва МТС Наркамзему Саюзу зьяўляецца намесьнікам наркома і падпарадкуецца [illegible] ркому, так і непасрэдна ЦК УсеКП(б). ПалітКіраўніцтва МТС Наркамзему Саюзу ажыцьцяўляе кіраўніцтва партыйнай, камсамольскай і палітычна - масавай работай машына - трактарных станцый праз свае мясцовыя органы: палітсэктары МТС краявых (абласных) зямельных кіраўніцтваў і наркамземы нацрэспублік.

Начальнік палітКіраўніцтва МТС Наркамзему Саюзу назначаецца і зьмяшчаецца ЦК УсеКП(б).

IV. Палажэньне аб палітаддзелах саўгасаў

а) ПАЛІТАДДЗЕЛЫ САЎГАСАЎ.

Палітаддзелы саўгасаў арганізуюцца пры кожным саўгасе ў складзе начальніка і двух яго намесьнікаў — па агульнапартыйнай рабоце і аднаго памочніка па камсамольскай рабоце.

Начальнік палітаддзелу саўгасу адна часова зьяўляецца намесьнікам дырэктара саўгасу па палітрабоце.

Начальнік палітаддзелу саўгасу ажыцьцяўляе поўнае кіраўніцтва партыйнай і камсамольскай работай і нясе поўную адказнасьць за партыйна-палітычную работу саўгасу, узгадняючы плян сваёй работы з дырэктарам саўгасу.

Начальнік палітаддзелу дапамагае дырэктару саўгасу ва ўсёй яго рабоце і пры гэтым ні ў якім выпадку не падменьваючы яго нясе побач з дырэктарам саўгасу адказнасьць за выкананьне вытворчых плянаў саўгасу і дырэктыў партыі і ўраду па дакладным выкананьні здачы прадукцыі дзяржаве.

Палітаддзелы саўгасаў прымаюць актыўны ўдзел у падборы кадраў саўгасаў, у тым ліку і адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў. Начальнік палітаддзелу саўгасу падпарадкуецца непасрэдна палітКіраўніцтву Наркамсаўгасаў і нясе адказнасьць у сваёй рабоце перад сакратарыятам абкому, краякому або ЦК нацкампартый.

Начальнік палітаддзелу саўгасу назначаецца і зьмяшчаецца Цэнтральным камітэтам УсеКП(б) па прадстаўленьні першых сакратароў крайкомаў, абкомаў і ЦК нацкампартый.

б) ПАЛІТКІРАЎНІЦТВА САЎГАСАЎ ПРЫ НАРКАМАЦЕ САЎГАСАЎ САЮЗУ.

Пры Наркамсаўгасаў Саюзу ССР арганізуецца палітКіраўніцтва саўгасаў у складзе начальніка, двух яго намесьнікаў і аднаго памочніка па камсамольскай рабоце.

Начальнік ПалітКіраўніцтва саўгасаў Наркамсаўгасаў зьяўляецца намесьнікам наркома і падпарадкуецца, як наркому, так і непасрэдна ЦК УсеКП(б).

ПалітКіраўніцтва саўгасаў наркамату збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў ажыцьцяўляе кіраўніцтва партыйнай, камсамольскай і палітычна масавай работай у саўгасах.

Начальнік палітКіраўніцтва саўгасаў Наркамсаўгасаў назначаецца і зьмяняецца ЦК УсеКП(б)

Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) па дакладзе тав. РУДЗУТАКА аб антыпартыйнай групоўцы Эйсмонта, Талмачова і Сьміркова А. П. і інш., ухваленая 12 студзеня 1933 году

I.

1) Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) устанаўлівае, што Эйсмонт Талмачоў, Сьмірноў і інш., заяўляючы на словах аб сваёй згодзе з лініяй партыі, на справе вялі антыпартыйную работу супроць палітыкі партыі. З гэтай мэтай яны стварылі падпольную фракцыйную групу, прычым Эйсмонт і Талмачоў вербавалі сваіх прыхільнікаў сярод элемэнтаў, якія разлажылися і буржуазных пераражэнцаў, што адарваліся ад рабочых мас.

2) У момант, калі партыя падагульвае вынікі найвялікшых перамог пяцігодкі, гэта група падобна руцінска-сьляпкоўскай антыпартыйнай групоўцы ставіла сваёй задачай па сутнасьці справы адмаўленьне ад палітыкі індустрыялізацыі краіны і аднаўленьне капіталізму, у прыватнасьці кулацтва.

Выходзячы з гэтага аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) пастанаўляе:

а) ухваліць пастанову прэзыдыуму ЦКК аб выключэньні з партыі Эйсмонта і Талмачова, як антысавецкіх людзей, якія разлажыліся і перарадзіліся і якія прабавалі арганізаваць барацьбу супроць партыі і партыйнага кіраўніцтва.

б) На падставе рэзалюцыі X зьезду партыі выключыць з Цэнтральнага Камітэту ЦК УсеКП(б) Сьмірнова, паляродзіўшы яго, што ў выпадку, калі ён усёй сваёй работай у далейшым заслужыць давер'я партыі,—будзе выключан з партыі.

II

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) устанаўляе, што члены ЦК т. т. Томскі і Рыкаў і кандыдат у члены ЦК тав. Шмідт замест сапраўднай і актыўнай барацьбы з антыпартыйнымі элемэнтамі за генэральную лінію партыі і практычную палітыку ЦК партыі, стаялі ў баку ад барацьбы з антыпартыйнымі элемэнтамі і нават падтрымлівалі сувязь са Сьмірновым і Эйсмонтам, бым па сутнасьці справы захвочвалі іх у іх антыпартыйнай рабоце, прычым усімі сваімі паводзінамі давалі повад усялякім антыпартыйным элемэнтам разьлічваць на падтрымань не былых лідэраў правай апазыцыі.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК патрабуе ад т. т. Рыкава, Томскага і Шмідта карэннай зьмены [illegible] паводзін у пытаньнях барацьбы з антыпартыйнымі элемэнтамі [illegible] пры працягу іх цяперашніх паводзін, да іх будуць дастасаваны суровыя меры партыйных спагнаньняў.

ПАПРАЎКІ

У дакладзе тав. Сталіна «Вынікі першай пяцігодкі» («Сав. Бел.» № 9) украліся наступныя прыкрыя памылкі: 1 старонка, 6-ты слупок, 3-ці абзац зьнізу надрукавана «Цяпер вы выйшлі», трэба чытаць «Цяпер мы... і г. д.

7-мы слупок, 2-гі абзац зьверху ў цытаце з Леніна пасьля слоў «Мы павінны выгнаць з яго ўсё» словы «лішняе, чаго» трэба замяніць словамі «сьляды ізьлішаставу, якіх...»

II

Максымальна узьняць тэмпы!

Закончыць загатоўкі. Вывезьці бульбу з глыбінкі і адгрузіць яе прамысловасьці

Цалкам, да аднаго кілеграму спагнаць цьвёрдыя заданьні з кожнай кулацка-заможнай гаспадаркі

Там, дзе бульбазагатоўкі не спалучаюцца з іншымі гаспадарчы-палітычнымі кампаніямі

У ходзе бульбазагатовак па МАГІЛЁЎШЧЫНЕ няма належнага пералому, не скарыстаны усе магчымасьці для больш пасьпяховага выкананьня пляну.

Магілёўскія раённыя, арганізацыі ня здолелі спалучыць правядзеньня збожжазагатовак і іншых гаспадарчы-палітычных кампаній з загатоўкамі бульбы. Выканаўшы плян збожжазагатовак на 31 сьнежня, раённыя арганізацыі не пераключылі свае сілы на выкананьне загатовак бульбы, ня здолелі правільна расставіць свае сілы на самых адказных вучастках. Аб гэтым яскрава сьведчыць ход загатовак па ШЧЭЖАРСКІМ сельсавеце, па якому плян бульбазагатовак ня выконваецца. Па гэтым сельсавеце гадавы плян бульбазагатовак яшчэ на 6-е студзеня быў выкананы толькі на 88,6 проц. Гэтым самым сельсавет не дадаў дзяржаве 372 цнт бульбы. З 1 па 6 студзеня маецца зусім нязначны прырост.

Галоўныя прычыны ганебнага адставаньня сельсавету, як мы вышэй адзначылі зьяўляецца тое, што апошні ня здолеў спалучыць правядзеньне збожжазагатовак з загатоўкамі бульбы, што пасьля ад'езду буксірнай брыгады падшэфнай шэйнай фабрыкі сельсавет і парт'ячэйка паслабілі барацьбу за бульбу і дэмабілізацыйным настроям ня быў даны належны адпор. Дрэнна працаваў камсод і камсамольская ячэйка: яны іх прайшло выкананьне пляну бульбазагатовак.

Вёска МЯДЗЬВЕДЗЯЎКА, адна з моцных у гэтым сельсавеце, мела усе магчымасьці для выкананьня пляну ў тэрмін, а між тым апошняя паводле даных на 6 студзеня не дадала дзяржаве яшчэ 30 цнт бульбы.

Члены сельсавету—ШАРАЎ, БАДУНОЎ, ЖЫЛЬЛЯНКОЎ і КАЗЛОЎ не скарысталі вопыт работы буксірнай брыгады і пасьля яе ад'езду супакоілі ся.

Гэта у значнай меры і скарыстаў кулак, які узмацніў арганізацыю сабатажу, які узяў пад свой уплыў больш адстаючую частку сялян, аб чым яскрава сьведчыць той факт, што рад аднаасобнікаў—МАШКОЎ, ФЕДАСЕНКА, і іншыя—злосна не выконваюць сваіх абавязацельстваў. Такое-ж становішча маецца і па вёсках ШЧЭЖАР і ПАДГОР'Е, гэтага сельсавету, якія яшчэ па вестках на 6-е студзеня не дадалі дзяржаве па 30—40 цнт бульбы.

Яшчэ горай стаяць справы з выкананьнем бульбазагатовак у вёсцы ЛЯМНІЦЫ. РАФАЛАЎСКАГА сельсавету, па якой выкананьне пляну бульбазагатовак складае 42—44 проц. Член сельсавету ВЕРАБЁЎ ніякай растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкай часткі вёскі аб завяршэньні бульбазагатовак не праводзіць. Ня ма рашучай барацьбы з кулацкім саботажам. Яшчэ ня ўсе цьвёрданькі выканалі свае заданьні па здачы (продажы) бульбы дзяржаве. Пасобныя работнікі тлумачаць такое выкананьне нерэальнасьцю пляну, што ён «непасільны». Але гэта апраўргае калгас «XIV КАСТРЫЧНІК», які ўжо выканаў свой плян бульбазагатовак на 100 проц.

Дзе-ж сакрэт перамогі гэтага калгасу?

Ён заключаецца ў тым, што калгасьнікі зразумелі усю важнасьць своячасовага і поўнага выкананьня бульбазагатовак, што быў дан рашучы адпор кулацкім тэндэнцыям аб тым, што па трэбна раней разьмеркаваць бульбу сярод саміх калгасьнікаў, а потым здаваць (прадаваць) дзяржаве.

Прыведзеныя і яшчэ дзесяткі новых фактаў сьведчаць аб тым, што кулацкі сабатаж ў загатоўках па радзе сельсаветаў Магілёўшчыны яшчэ да канца ня зломлен.

Рашуча пакончыўшы з дэмабілізацыйнымі настроямі, самацёкам, бязьлітасна перамагаючы кулацкія супраціўленьні, перайманочы вопыт перадавых сельсаветаў і калгасаў, якія ўжо выканалі свае пляны—Магілёўшчына даб'ецца перамогі на фронце бульбазагатовак, даб'ецца выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб выкананьні заготовак, кожным сельсаветам, калгасам і двором у паасобку.

К. М.

Вузьдзеншчына працягвае зрываць бульбазагатоўкі

ВУЗДА. Тэмпы бульбазагатовак на раёне недапушчальна слабыя. Калі на 1-е студзеня плян быў выкананы на 83,4 проц., то на 9-е студзеня процант выкананьня дасягнуў толькі 85,4 проц., гэта значыць што прырост за 10 дзён складае ўсяго 2 проц. Каменскі сельсавет выканаў заданьне на 69,7 проц. Калгасы выканалі заданьне на 71 проц. Сакратар кандыдацкай групы Штукач, ён-жа і старшыня калгасу «Ленін», не рарадзіўся ў кулацкага агента з партбілетам у кішэні і зросься з кулакамі Жыгалкам, Цішковічам, Кіялём і інш., якія пралезьлі у калгас і сабатуюць загатоўкі. Штукач і па сёньняшні дзень яшчэ ня прыцягнуты да адказнасьці.

Гаспадарка Аксенчыка Т. (пасёлак Камяное) мае пахаці толькі 0,5 га, а да гаспадаркі даведзена акраяя пляну па ільна-семі, заданьне па здачы 50 пудоў бульбы і 9 пудоў збожжа. У выніку гэтых запібаў плян загатовак бульбы па сельсавеце выкананы толькі на 71 проц. Сакратар партячэйкі Гурскі і старшыня сельсавету апраўдваюцца тым, што плян нерэальны.

Па Зеньковскім сельсавеце плян загатовак бульбы выкананы толькі на 86,5 проц., а старшыня сельсавету Колас сакратар партячэйкі Буцько запэўніваюць, што «ўсё добра». А калі прадстаўнікі райкому партыі зрабілі праверку, то высьветлілася, што па сельсавеце яшчэ не даведзены плян па бульбе у колькасьці 8 тон. Па вёсцы Чурылава гэтага-ж сельсавету, яшчэ не разьмеркаваны заданьні на 165 цнт бульбы; па вёсцы Воркі—на 7 цнт па пасёлку члена сельсавету Аксенчыка на 23 гаспадаркі трэба было разьмеркаваць 20 цнт. бульбы, а разьмеркавана толькі 3 цнт.

Камянецкі сельсавет калектывізаваны па 90 проц., выканаў плян бульбазагатовак толькі на 72,5 проц. Прычыны адставаньня гэтага сельсавету заключаюцца ў тым, што паасобныя кіраўнікі калгасаў сталі на шлях ашукваньня дзяржавы. Старшыня калгасу імя Молатава—Нікановіч не здаў дзяржаве ніводнага кілё бульбы, а квітанцыю аб здачы 300 клг цыкорыі пераробку такім чынам, што атрымалася, што калгасам здадзена не цыкорыя, а бульба.

Па Целякоўскім сельсавеце (пасёлак Падбалоцьце), член камісіі садзейнасьці Андрыеўскі Т. ня выконвае абавязацельстваў па здачы бульбы, а сельсавет ня прыцягвае яго да адказнасьці.

Зусім дрэнна змагаюцца за выкананьне загатовак Сьцеблянская камсамольская ячэйка на чале з сакратаром ячэйкі Лойка.

Камсамолец Тухарскі Б. ня выканаў сваіх абавязацельстваў па загатоўках, заяўляючы, што плян нерэальны. Камсамолец Кантончык А. заяўляе: «Мне не да загатовак, я рыхтуюся ў навучальную ўстанову». Да гэтых кам самольцаў не прыняты меры.

РК КП(б), РК ЛКСМБ і РВК павінны зараз-жа прыцягнуць да адказнасьці перараджэнцаў, кулацкіх агентаў з партбілетам у кішэні. Вакол бульбазагатовак павінна быць мабілізавана ўвага ўсёй працоўнай прамадзкасьці.

(Белта).

Улік паступленьня цьвёрдых заданьняў яшчэ не наладжаны

КРЫЧАЎ. Гадавы плян загатовак бульбы паводле вестак на 5-е студзеня па раёне выкананы на 74,9 проц.

Асноўная прычына ганебных тэмпаў загатовак бульбы ў тым, што, пасьля выкананьня пляну адгрузкі бульбы Ленінграду, далейшая загатоўка яе ня была пастаўлена як адна з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Зусім аслабла вакол бульбазагатовак масава-выхаўчая работа і папуляризацыя дырэктыў партыі і ўраду аб загатоўках.

Эманулёўскі і Задабрасьцянскі заводы, якія зараз зьяўляюцца асноўнымі загатоўцамі пусьцілі справу загатовак бульбы на самацёк. Партыйныя ячэйкі і сельсветы (Паланіцкі, Міхеёўскі, Касьцюшкаўскі і іншыя) таксама не прынялі канкрэтных мер да арганізацыі загатовак бульбы. Гэтым толькі і магчыма тлумачыць той факт, што Эмануілаўскі завод выканаў свой плян загатовак толькі на 56,4 проц., а Задабрасьцянскі—57,8 проц.

Упаўнаважаныя заводаў не працуюць у прымацаваных сельсаветах, а дырэкцыя заводаў ня кіруе апошнімі.

У Касьцюшкаўскім, Баяўскім сельсаветах упаўнаважаныя Задабрасьцянскага заводу бываюць толькі праездам па адной дзьве гадзіны і не вядуць там ніякай масава-арганізацыйнай работы.

Трэба адзначыць, што ні адзін з загатоўцаў ня мае зьвестак як адзе спагнаньне бульбы ад цьвёрдавікоў. З гэтага можна бачыць, як паступае бульба ад цьвёрдавікоў, якая вядзецца барацьба з кулацкім сабатажам.

Дапушчаныя памылкі павінны быць выпраўлены. РК КП(б)Б, РВК і загатоўчыя арганізацыі павінны мабілізаваць усе свае сілы на своячасовае выкананьне бульбазагатовак.

З кулацкім сабатажам павінна быць праведзена рашучая барацьба.

С. Ш.

Кандыдат на чорную дошку

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Партыя і ўрад устанавілі ў якасьці апошняга тэрміну сканчэньня загатовак бульбы 15 студзеня. Між тым, напярэдадні сканчэньня гэтага тэрміну за раёнам лічыцца яшчэ вялікая запазычнасьць, якая складае 2700 тон. Тэмпы загатовак зусім невыстарчальныя. Пяцідзёнка — з 5 па 10 студзеня—дала прырост толькі ў 8 проц.

Заданьне партыі можа быць выкана на з посьпехам. Аб гэтым сьведчыць вопыт перадавых сельсаветаў: ПІРЭВІЦКАГА, які своячасова і поўнасьцю выканаў плян, Ст. РУДНЯНСКАГА і КАЗІМІРАЎСКАГА, якія наблізіліся да выкананьня пляну.

Рад сельсаветаў (КАРОТКАЎСКІ, МАЛЕВІЦКІ, Н. - МАРКАЎСКІ, КАБАНАЎСКІ, БУХАРЫНСКІ) на гэтым вучастку не зламалі кулацкі сабатаж, кі нулі справу загатовак на апартуністычны самацёк.

Загатоўчыя арганізацыі раёну таксама паддаліся дэмабілізацыйным настроям. Яны канчаткова заблыталіся і не наладзілі нават дакладнага і своячасовага уліку ходу выкананьня пляну загатовак, не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай кампаніяй.

ЦК КП(б)Б сваёй пастановай папярэдзіў Жлобінскі раён, што калі ён не даб'ецца рашаючага пералому на працягу бліжэйшых дзён, ён будзе занесены на чорную дошку з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.

Гэта пастанова павінна мабілізаваць усю партарганізацыю, усе адстаючыя сельсветы, увесь партыйна - савецкі актыў на тэрміновае выкананьне пляну бульбазагатовак.

Перанёсшы выпрабаваныя мэтады збожжазагатовак на гэты вучастак загатоўчай работы, зламаўшы кулацкі сабатаж, даўшы сакрушальны адпор варожым элемэнтам і іх агентуры,—раён павінен пасьпяхова завяршыць загатоўкі бульбы у бліжэйшыя 2—3 дні.

ЗАКРЭЎСКІ.

„Засіласавалі" насенную бульбу

У калгасе «Ураджайны край» (Пухавіцкі сельсавет) насенны фонд бульбы ссыпалі ў сілосную яму і замуравалі так, што бульба была пазбаўлена доступу паветра.

Больш 500 тон бульбы спарылася і зараз наватна прыгодна для корму.

Высьветлена, што праўленьне калгасу на чале са старшынёй заможнікам Ільневічам зусім сьвядома прарабіла гэтую шкодніцкую справу.

Вінаватыя павінны быць сурова пакараны.

ПАЎЛА.

СУСТРЭЦЬ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ ВА УСЕАРУЖЖЫ

Неадкладна скончыць засыпку насенных і страхавых фондаў; завяршыць збожжазагатоўкі

За зрыў засыпкі насенных і страхавых фондаў пад суд

БУДА-КАШАЛЁЎ. (Па тэлеграфе ад нашага спэцкора).

Плян засыпкі насенфондаў на 10 студзеня па раёне выкананы: па збожжы толькі на 65 проц., па тэхкультурах—на 88 проц. па бульбе—86 проц.

Перавыканалі пляны засыпкі насенфондаў КАШАЛЁЎСКІ (105 проц.) і ДУРАВІЦКІ (109 проц.) сельсаветы. Злачынна зрываюць засыпку насенных фондаў ПАТАПАЎСКІ сельсавет (55 проц. пляну), ГУБІЦКІ (38 проц.) і рад іншых.

У пасобных калгасах пануюць спажывецка-кулацкія настроі, аднору якім з боку раду партячэек і сельсаветаў не даецца.

Так, у калгасе імя ЯКАЎЛЕВА, ЗАБОЙСКАГА сельсавету, разьмеркавана натуральная частка даходу, а насеньня і страхавыя фонды не засыпаны. Сельсавет прымірэнча аднесься да гэтай справы.

Бюро РК КП(б)Б і прэзыдыум РВК абвясьцілі вымову праўленьню калгасу імя ЯКАЎЛЕВА. Старшыня калгасу Грушчэнкаў за зрыў засыпкі і разбазарваньне насенных і страхавых фондаў адданы пад суд.

Калгасу імя ЯКАЎЛЕВА прапанавана ў двухдзённы тэрмін засыпаць насенны і страхавы фонд.

ДУБРОЎСКІ.

Выканалі абавязкі перад дзяржавай

У выніку сыстэматычна правадзімай палітычна - растлумачальнай работы членамі сельсавету і паасобнымі ўдарнікамі калгаснага і вясковага актыву,—беднякі і сераднякі вёскі Паўтарыкава, Сар'янскага сельсавету (Дрысенскі раён) выканалі свае абавязкі перад дзяржавай.

Плян збожжазагатовак выкананы на 119, 4 проц., лёнатрасты—на 110 проц., лёнавалакна—на 114,5 пр., лёнанасень—на 100 проц., Так сама выкананы цалкам фінпляны па мяса загатоўкі 1932 году.

Беднякі і сераднякі аднаасобнікі вёскі Паўтарыкава заклікаюць ўсіх працоўных аднаасобнікаў раёну пасьледаваць іх прыкладу і абавязуюцца рашуча змагацца з кулацкім сабатажам у загатоўках з тым, каб тэрмінова завяршыць загатоўкі ўсіх відаў.

К. Барташэвіч.

Да суровай адказнасьці кулацкіх агентаў

АСІПАВІЧЫ. Праўленьне калгасу «Пралетары», Ясенскага сельсавету, злачынна зрывае падрыхтоўку да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Замест таго, каб у першую чаргу выканаць дадзены плян па дзяржаўных загатоўках, засыпаць насенныя і страхавыя фонды і рэшту збожжа з астатнімі прыбыткамі разьмяркаваць сярод калгасьнікаў па колькасьці і якасьці затрачанай працы,—яны зраблі наадварот. Гарох і вику яны разьмеркавалі сярод калгасьнікаў, не пакінуўшы на насеньне ніводнага кілёграму.

Гэта было зроблена старшынёй калгасу—кулацкім агентам Зелянеўскім і рахункаводам былым царкоўным служкай Шабуняй.

Неабходна дадаць, што пад іхнім кіраўніцтвам калгас ўвесь час ня выконваў плянаў загатовак. Калгас і да гэтага часу яшчэ не разьлічыўся з дзяржавай.

За разбазарваньне насенфондаў як за зрыў падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы Зелянеўскага і Шабуню трэба неадкладна аддаць пад суд.

Мік. Беразоўскі.

Пастанова СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б)

У сувязі з тым, што ГОРКАЎСКІ край, КРЫМСКАЯ АССР, СЯРЭДНЯВОЛСКІ край, ЛЕНІНГРАДСКАЯ вобласьць і ІВАНАЎСКАЯ вобласьць датэрмінова выканалі ўстаноўлены для іх СНК СССР і ЦК УсеКП(б) гадавы плян збожжазагатовак і забясьпечылі сябе насеньнем для яравой сяўбы і ў адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 2 сьнежня 1932 г. дазволіць калгасам, калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам паказаных раёнаў бесьперашкодна прадаваць свае збожжа (мукой, зернем, печаным хлебам) як дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям, так і на базарах і станцыях ў межах сваёй вобласьці, краю, рэспублікі.

Старшыня СНК СССР МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар ЦК УсеКП(б) СТАЛІН.

АБ ЗЬНЯЦЬЦІ З ЧОРНАЙ ДОШКІ

Пастанова ЦК КП(б)Б

Зьняць з чорнай дошкі вёскі: Станькова і Каменку, Дзяржынскага раёну, на якіх выкананы пляны загатовак.

ЧОРНАЯ ДОШКА

зрыўшчыкаў загатовак

Пастановай СНК БССР, ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны:

За зрыў загатоўкі бульбы і ільна:

Талочынскі, Горацкі і Дубровенскі раёны.

За зрыў загатовак ільна:

Сеньненскі, Сіроцінскі і Расонскі раёны.

За зрыў загатовак бульбы:

Прапойскі раён і сакратар райкома Іваноў, старшыня РВК Леоненко і ўпаўнаважаны ЦК Шындлер:

Кармянскі раён і сакратар РК Саладухін, старшыня РВК Новікаў і ўпаўнаважаны ЦК Валодзька.

За зрыў загатовак усіх відаў занесены на чорную дошку наступныя сельсаветы

па Чачэрскім раёне— Глыбачанскі,

па Буда - Кашалёўскім—Губіцкі,

па Дзяржынскім—в. Шатаноўшчына,

па Пятрыкоўскім раёне— Пціцкі

па Клімавіцкім раёне—Красавіцкі сельсавет,

па Лепельскім раёне—Ляхаўскі сельсавет і вёскі Кругляцы і Сталбцы,

па Чэрыкаўскім раёне—Каменскі сельсавет,

па Бягомльскім раёне—Дамаржыцкі сельсавет,

па Лагойскім раёне—Гайнінскі,

па Нараўлянскім р-не—Мухаедаўскі,

па Чашніцкім раёне—Ульлянавіцкі і Стражавецкі с-с.

па Магілёўскім раёне—Хонаўскі, Рафалаўскі, Гусьліщанскі,

па Клічаўскім р-не: — Віркаўскі, Грыбавецкі, і Дубенскі

па Суражскім р-не:—Камароўскі і Войтаўскі

па Аршанскім р-не:—Буеўскі

па Пухавіцкім р-не:—Гарэліцкі, Слабодакі, Задашчанскі і Шацкі

па Вушацкім раёне— Усайскі сельсавет.

па Крычаўскім—Цяшанскі сельсавет

па Дрысенскім р-не—Юзэфаўскі, Каркалеўскі.

па Рэчыцкім раёне—Артукоўскі, Хойніцкі і Каравацкі сельсаветы:

па Мсьціслаўскім раёне—Татаршчанскі і Даўгавіцкі сельсаветы

Дадаткова заносіцца на чорную дошку

ПА ЖЛОБІНСКІМ РАЁНЕ—Новамаркоўскі сельсавет за зусім ганебнае адставаньне па нарыхтоўцы бульбы

Пытаньне аб пераглядзе сельсаветаў, занесеных на чорную дошку вырашыць пасьля атрыманьня адказаў на тэлеграфныя запытаньні.

Што было ў Негаўцы

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Збожжазагатоўкі гэтага году праходзяць у жорсткай клясавай барацьбе. Перад кожным настаўнікам пытаньне:

— З кім ты?

Рубам настаўнік, нейтральным ня можа быць ніхто.

Ці актыўнае змаганьне разам з рабочай клясай над кіраўніцтвам партыі, ці скочваньне ў лягер клясавага ворага, бо «барацьба за хлеб—гэта барацьба за сацыялізм» (Ленін). Клясавая барацьба ў час загатовак дае вострыя ўспышкі. Кулак імкнецца ня даць збожжа дзяржаве. Хавае яго, разбазарвае, абы збожжа не папала ў рукі Савецкай уладзе.

Збожжазагатоўкі гэтага году з асаблівай яскравасьцю падкрэсьліваюць клясавы характар школы, адкрываюць вочы кожнаму сьляпцу на тое, што школа ня можа быць нейтральнай, паказваюць непарыўную сувязь школы з жыцьцём.

Кожны, хто хоча быць актыўным будаўнікам [illegible] ваага грамадзтва, павінен добра разумець, што школа [illegible] савай барацьбы.

*

Ілюструем ролю школы ў барацьбе за збожжа фактамі. На фактах паказам, што школа—зброя клясавай барацьбы, што школа—адзін з важнейшых участкаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Падамо факты, якія адзначаны на раённай нарадзе настаўнікаў Буда-Кашалёўскага раёну, якой вялікую ўвагу надало раённае кіраўніцтва.

— Ідзеце дзеткі ў сельсавет,—кажа сваім сыном-школьнікам цьвердавік,—прыслухвайцеся, што там будуць казаць. Каго будуць абкладаць... Пільна слухайце, каб дома маглі расказаць.

Вось кулацкая разьведка. Вось скарыстаньне кулаком дзяцей-школьнікаў у сабатажы загатовак.

Зразумела, што гэтыя «разьведчыкі» ў самай школе зьяўляюцца кулацкай агентурай.

— Кулак праз школу імкнецца агітаваць супроць загатовак, ахайваць сацыялістычнае будаўніцтва, мерапрыемствы партыі і ўраду—гаварылі ў сваіх выступленьнях настаўнікі. На перанынках дзеці кулакоў выказваюць думкі сваіх бацькоў з мэтай узяць пад свой уплыў школьнікаў.

З боку настаўніцтва патрэбна высокая клясавая пільнасьць, вялікая работа, каб школа была актыўным дапаможнікам партыі і ўлады. У барацьбе з клясавым ворагам. У выхаваньні людзей злольных завяршыць будаўніцтва сацыялізму.

Асноўная маса настаўніцтва, Буда-Кашалёўскага раёну з гэтай задачай спраўляецца.

Настаўнікі ШАПАВАЛАЎ і МЯДЗЬВЕДЗЯЎ—ідуць у першых радох актывістых у барацьбе за збожжа.

Раённая нарада настаўнікаў вынесла пастанову:

— Мабілізаваць сябе на засыпку ва ўстаноўлены тэрмін насенных і страхавых фондаў на завяршэньне ўсіх відаў загатовак. 180 настаўнікаў накіраваліся ў сельсветы для выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў.

Узор барацьбы за збожжа дала Негаўская школа. (Б. Люшаўскі сельсавет). Гэтая школа выпускае насьпенгазэты, зьмест якой прысьвечаны збожжазагатоўкам.

Негаўская школа ўсю сваю работу падпарадкавала змаганьню за збожжа. Аб тым сьведчаць лёзунгі, гутаркі, увязка прадметаў са збожжазагатоўкамі.

Школьнік—агітатар за збожжазагатоўкі, дапаможнік у выкрыцьці кулацкага збожжа. Негаўская школа добра справілася з вырашэньнем гэтай задачы.

Гэтая школа правяла вялікую работу з насельніцтвам.

Насьценгазэта школы вывешвалася і на вуліцы, каб насельніцтва Негаўкі магло яе чытаць. Школай праведзена дэманстрацыя, задача якой была арганізаваць чырвоны абоз са збожжам.

Чуць золак—па доўгай вуліцы Негаўкі пайшлі дзіцячыя рады з плякатамі і лёзунгамі. Плякаты і лёзунгі гаварылі аб жорсткай клясавай барацьбе, якая адбываецца вакол загатовак збожжа. Заклікалі калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў рашучым пацісканам зламаць кулацкі саботаж, бездакладна выканаць свой абавязак перад пралетарскай дзяржавай.

Уперадзе дэманстрантаў ішла брыгада школьнікаў, якая заходзіла ў кожны двор—мабілізавала кожны двор на бездакладную здачу (продаж) збожжа дзяржаве.

У 10 гадзін раніцы школа пачала свае заняткі.

У 10 гадзін раніцы 40 падвод выцягнуліся па доўгай вуліцы Негаўкі. Гэта чырвоны абоз павёз збожжа на ссыпны пункт. Чырвоны абоз—арганізаваны школай.

Прозьвішча загадчыка Негаўскай школы—ЛІПНІЦКІ.

Негаўская школа дала ўзоры прыклад таго, як школа павінна дапамагаць партыі ў выкананьні гаспадарча-палітычных задач. Гэты вопыт трэба зрабіць здабыткам кожнай школы. Кожная школа павінна дапамагаць такой працы, узор якой дала Негаўская.

На ўсе настаўнікі Буда-Кашалёўскага раёну змагаліся за збожжа. На канфэрэнцыі былі названы прозьвішчы тых, хто правяў бязьдзейнасьць у гэтай важнейшай справе. ШВЕД і ГРЫШКОВА стаялі ў баку. Сузіральнікамі глядзелі, як партыйны і савецкі актыў змагаецца за збожжа.

А ЛЯВОНЧЫКАЎ з жалем у сэрцы назіраў, як кулак здаваў цьвёрдае заданьне.

КАВАЛЕНКА ведаў, што калгасьніца, у якой ён жыве, схавала кулацкае збожжа. Ведаў, але маўчаў. Пакрываў зладзейскую схову, удзельнічаў у кулацкім сабатажы збожжазагатовак.

ЛЯВОНЧЫКАЎ, КАВАЛЕНКА—кулацкія агенты. Іх прозьвішчы прагучэлі рэзкім дысанансам на раённай канфэрэнцыі настаўнікаў. Рады будакашалёўскага настаўніка павінны быць ачышчаны ад тых, хто дапамагаў кулацкаму сабатажу.

Дысанансам прагучэла на канфэрэнцыі і назва ЯЛЕНЕЦКАЙ школы.

Грязь, пыл, ніводнага партрэту, лёзунгу...

Ня школа, а пустка. Чым адрозьніваецца гэтая школа ад старой школы?!

На канфэрэнцыі была адзначана слабая барацьба раду школ за веды вучняў. Слабая работа паасобных настаўнікаў над сабой.

Гэтыя недахопы—шчыліны, куды можа пралезьці клясавы вораг. Гэтыя шчыліны трэба закрыць нязхільнай рэалізацыяй пастаноў ЦК аб школе.

Збожжазагатоўкі паказалі, што кулак імкнецца скарыстаць школу як сродак сваёй шкоднай агітацыі.

УЛ. ДУБРОЎСКІ.

Лёнапрадукцыю—сацыялістычнай прамысловасьці

Бязьлітасна змагацца з усялякімі спробамі паслабіць лёназагатоўкі

Неадкладна завяршыць выкананьне пляну

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

СЯННО. 6-га студзеня адбыўся надзвычайны адкрыты сход-нарада раённага партактыву, прысьвечаны выкананьню пляну загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў, у прыватнасьці ільну.

На сходзе, які скліканы быў у зьвязку з занясьненьнем Сеньненшчыны СНК і ЦК КП(б)Б на чорную дошку за зрыў лёназагатовак, прысутнічалі упаўнаважаныя ЦК КП(б)Б т. т. Берзін, і Бэндэ, а таксама прадстаўнікі цэнтральнага і раённага друку.

Сход паказаў, што першыя два дні прабываньня раёну на чорнай дошцы не далі належнага пералому ў бок мабілізацыі мас на хутчэйшую ліквідацыю прарыву, не ўскалыхнулі парт арганізацыю на сапраўды - бальшавіцкую барацьбу за лён.

Рад фактаў, прыведзеных сакратаром райкому тав. Душкевічам сьведчыць пра засьмечанасьць паасобных низавых зьвеньняў раённай партыйнай арганізацыі перараджэнцамі, кулацкімі агентамі з партбілетам у кішэні.

У Пустынскім сельсавеце, напрыклад, сакратар ячэйкі папярэджвае кулака:

— Уцякай, пакуль ня позна, бо цябе гэтымі днямі раскулачаць.

У Стадольскім, Латыгальскім, Нямойцянскім сельсаветах сакратары парт'ячэек даводзяць, што «планы не рэальны».

Некаторыя ўпаўнаважаныя райкому, накшталт тав. Мазурэнкі (сакратар РК ЛКСМБ) апраўдваюць сваю бязьдзейнасьць тым, што «ня было дырэктыў».

Штрафы натурай з цьвёрдавікоў не спагняюцца. Клясавага падыходу ў суду няма.

У МАШЧОНСКІМ сельсавеце, напрыклад, цьвёрдавікі выканалі толькі 0, 59 проц. заданьня па лёну. Замест 110 цнт у дзень, гэты сельсавет 3-га студзеня здаў 6 цнт, 4-га—5 цнт, 5-га—8 цнт.

Характарная «адгаворка» ў рэдактара тав. АКСЁНАВА, які імкнецца прыкрыць апартуністычную практыку раённай газэты гучнымі фразамі

— У раёне быў раней адзін пісьменны чалавек, ды і той паехаў... С кім-жа выпускаць газэту?

Выступленьне тав. АКСЁНАВА зусім правільна было расцэнена, як праява своеасаблівага «барского высокомерия»...

Сход абвясьціў сябе мабілізаваным на хутчэйшае выкананьне пляну лёназагатовак, з тым каб да 10 студзеня лён быў здадзены дзяржаве поўнасьцю.

Раён павінен заваяваць сабе права на тое, каб як мага хутчэй сьпісьці з чорнай дошкі «рыўшчыкаў лёназагатовак.

Юр. ЛЯВОНЧЫ.

Камісія садзейнасьці па... абароне кулакоў

АСІПАВІЧЫ. Па вёсцы Пратасэві, (Верацоўскі сельсавет) лёназагатоўк выкананы ўсяго на 60 проц. Асноўныя прычыны прарыву—кулацкі саботаж лёназагатовак камісіі садзейнасьці і члену сельсавету Доўгаля Яўхіма якія абсалютна нічога ня робяць, каб прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі выканаць цьвёрдыя заданьні. Члены камісіі садзейнасьці Крупько Янка і Аўдакімовіч, член сельсавету Аўх. Доўгаль, сумесна з намесьнікам старшыні сельсавету Хведарам Аўдакімовічам наймысьля зьменшылі плян лёнагатовак па гэтай вёсцы—па лёнавалакне на 6 цнт. і па лёнасемі на 5 цнт. Гэтым самым кулацка-заможным гаспадаркам былі вызначаны нязначныя заданьні.

РайКК-РСІ павінна праверыць гэту справу і неадкладна прыцягнуць да адказнасьці абаронцаў кулакоў.

М. Беразоўск.

Клетчанскі сельсавет выканаў плян лёназагатовак

СІРОЦІНА. На аснове разгортваньня масавай работы, рашучага націску на кулацка-заможную частку вёсак Клетчанскі сельсавет на 10 студзеня завяршыў лёназагатоўкі. Па сельсавеце загатоўлена 52,6 тоя лёнавалакна, што складае 100 проц. гадавога пляну.

(Белта).



Лёнавалакно—на рамысловасьці.

Згнаілі 7200 снапоў канапель

ПЕТРЫКАЎ. У калгасе «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН» (Капаткевіцкі сельсавет) злачынна адносяцца да апрацоўкі тэхкультур. З прычыны злачынных безгаспадарчасьці і галавацяпскага кіраўніцтва засталося ня ўбраным 3,5 га канапель і 2,5 га лёну. Выбраныя канаплі былі закладзены ў мочку, але праўленьне калгасу забылася аб гэтым і канаплі засталіся зімаваць. Такім чынам згнаілі 7.200 снапоў канаплянай саломы. У кастрычніку мінулага году быў складзены акт рэвізыйнай камісіяй і на этым справа закончылася.

Партыйная ячэйка нічым не рэагавала на падобнае злачынства і ня ўжыла ніякіх захадаў, каб жорстка пакараць шкоднікаў і агентаў клясавага ворага, якія пралезьлі ў калгас, каб разбурыць яго вытворчасьць.

Хв. КЛІМЯНОК.

За ГРАНІЦАЙ

Водгукі буржуазнага друку на прамову тав. Сталіна

ЛЕНДАН. 12-I. Прэса падае кароткія вытрымкі з дакладу тав. Сталіна. «Таймс» вылучае з дакладу цытату аб забясьпячэньні ўстойлівасьці савецкай валюты.

«Фінансыяль-Ньюс» зазначае, што пяцігодка атрымала посьпех у галіне цяжкай прамысловасьці.

Перадавы артыкул «Дэйлі Тэлеграф» таксама адзначае посьпехі цяжкай індустрыі. «Калі,—гаворыцца ў перадавым,—выходзіць з даваеннага ўзроўню індустрыі, дык дасягнуты зьдзіўляючы прагрэс». Газэта імкнецца заспакоіць сваіх буржуазных чытачоў паказаньнямі на «нерэнтабельнасьць» некаторых савецкіх прадпрыемстваў.

***

ВЕНА. 12-I. Венскі друк публікуе падрабязна прамову тав. Сталіна на пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б). «Нэйе Фрайе Прэсе» піша: «прамова Сталіна прасякнута гордай сьвядомасьцю посьпехаў, якія дасягнуты ў імя ідэі бальшавіцкай дзяржавы». Фашысцкая «Дэйч-Эстэрэйхішэ Тагэсцэйтунг» паказвае, што «небясьпека бальшавізму» заключаецца у тым, што народы СССР гатовы на вялізарнейшыя ахвяры ў іх тарэсах індустрыялізацыі».

***

ПРАГА. 12-I. Усе чэхаславецкія газэты друкуюць у падрабязных вытрымках даклад тав. СТАЛІНА. «Чэшске Слово» камэнтуючы даклад адзначае: «індустрыялізацыя краіны, якая праведзена ў духу ленінскіх указаньняў, бясспрэчна робіць посьпехі. Нельга ня браць усур'ёз словы Сталіна аб тым, што індустрыялізацыя зьяўляецца вынікам энтузіязму і супрацоўніцтва рабочых і інжынэраў. Індустрыялізацыя СССР асабліва выдзяляецца на фоне сусьветнага эканамічнага крызісу». «Народны лісты» і «Народная палітыка» нездаволены дакладам і робяць антысавецкія выпады.

***

ПАРЫЖ. 11-I. «Тан», «Орд», «Рэспублік» і інш. газэты зьмясьцілі сёньня паведамленьні аб дакладзе Сталіна на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б).

„Ваенныя апэрацыі ў Жэхэ павінны пачацца"

Заява японскага ваеннага міністра

ТОКІЁ. 12-I. Усе газэты публікуюць заяву японскага ваеннага міністра, у якой зазначаецца, што

«ПРАВІНЦЫЯ ЖЭХЭ АРГАНІЧНАЯ І НЕАДЫМНАЯ ЧАСТКА МАНЧЖУРСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ» і таму «усе элементы, якія парушаюць парадак у ЖЭХЭ, павінны лічыцца бунтаўшчыкамі супроць Манчжурскай дзяржавы. Тыя, хто ўрываецца звонку, павінны лічыцца элемэнтамі, якія ўварваліся на Манчжурскую тэрыторыю. Меры, якія ўжываюцца Манчжурскай дзяржавай у мэтах самаабароны і прыдушэньня падобных элемэнтаў нічым не адрозьніваюцца ад карных экспэдыцый, праведзеных супроць генэралаў ЛІ-ДУ, ДЗІН-ЧОУ і СУ-БІН-ВЕНЯ ў Манчжурыі і зьяўляюцца ўнутранай справай Манчжурскай дзяржавы».

Заява прапануе японскаму насельніцтву захоўваць парадак і спакой у час ваенных апэрацый у Жэхэ, якія павінны пачацца

У другой заяве ваеннага міністэрства гаворыцца «аб ходзе зьнішчэньня бандытызму ў Манчжурскай дзяржаве», у якой адзначаецца, што «на Манчжурскай тэрыторыі знаходзіцца 130 тыс. салдат добраахвотнікаў і бандытаў, у тым ліку 4 пяхотныя брыгады і 3 кавалерыйскія брыгады ТАН-ЮЙ-ЛІНА (старшыня правінцыяльнага ўраду Жэхэ) і 4 пяхотныя брыгады ЧЖАН-СЮЭ-ЛЯНА, «якія ўварваліся звонку на тэрыторыю Жэхэ і выклікаюць у Жэхэ непарадкі».

У заяве зазначаецца што паводле даных ваеннага міністра, брыгады ЧЖАН-СЮЭ-ЛЯНА капаюць акопы ў раёне Чафыну (на паўночны ўсход ад Чэнда) у Цзяцюзіне (на ўсход ад Чафыну), у Ліюане а таксама ўздоўж Вялікай сьцяны.

***

ТОКІЁ. 12-I. «Сімбун-Рэнго» паведамляе з Цзіньчжоў, што японскія ваенныя ўлады накіравалі некаторыя японскія часьці ў раён Тунляо (недалёка ад мяжы правінцыі Жэхэ) «для ўдзелу ў ахове чыгунак, якім пагражае небясьпека з боку буйных атрадаў паўстанцаў, што ідуць з раёну Кайлу (правінцыя Жэхэ) на ўсход і паўночны ўсход. Паводле слоў агенцтва, наступ атрадаў паўстанцаў пачаўся па загаду Чжан-Сюэ-Ляна.

Інцыдэнт у Чань-Лі

ШАНХАЙ. 12-I. На станцыі ЧАНЬ-ЛІ ў 30 мілях на поўдзень ад Шанхай-Гуаня японскі жандар быў паранены кітайскімі пасажырамі цягніка, калі пачаў стральбу па кітайскіх салдатах на станцыённай пляцформе. Англійскі служачы чыгункі выратаваў японскага жандара ад натоўпу і адаслаў яго пад аховай у японскі штаб.

Мясцовая японская ўлада безадклад на ўручыла пратэст кітайцам, патрабуючы адкліканьня кітайскага войска і паліцыі з чыгуначнай зоны, перадачы кіраўніцтва чыгуначнай паліцыі Японіі, арышту вінаватых, кампэнсацыі за зьбіваньне японскага жандара і гарантыі бясьпекі на далейшы час.

У пачатку сьнежня з усіх канцоў ПАЗШ у Вашынгтон сьцякаліся калёны амэрыканскіх беспрацоўных, каб патрабаваць ад кангрэсу безадкладнай дапамогі. Вашынгтонская ўлада на працягу двух дзён пратрымала беспрацоўных пад Вашынгтонам, не дазваляючы ім увайсьці ў горад. Але сваёй настойлівасьцю і ўпартасьцю беспрацоўныя нарэшце дамагліся пропуску ў Вашынгтон. Зразумела, уся паліцыя была мабілізавана для «аховы парадку».

НА ЗДЫМКУ: фота-рэпарцёры вашынгтонскіх газэт чакаюць прыбыцьця калёны дэманстрантаў у Вашынгтон. Таму што любімым мэтадам амэрыканскай паліцыі пры разгоне дэманстрацыі зьяўляецца ўжываньне сьлёзагонных газаў, фота-рэпарцёры надзелі супрацьгазы.

Японія здымае з сябе адказнасьць за агрэсію ў Кітаі

ШАНХАЙ. 12-I. Газэта «ЧАЙНА ТАЙМС» паведамляе, што японскі пасол у Кітаі АРЫОСІ зьвярнуўся з «папярэджаньнем» да міністэрства замежных спраў нанкінскага ўраду. АРЫОСІ ўказаў:

1) таму што шанхайгуаньскі інцындэнт мае мясцовае значэньне, дык кітайскі ўрад павінен ужыць захады да яго ліквідацыі;

2) калі ў зьвязку за нядаўна прыняй тай Гаміндаам антыяпонскай рэзалюцыяй пасьледуюць якія-небудзь выступленьні, дык адказнасьць за іх будзе падаць на кітайскі ўрад.

3) Калі нанкінскі ўрад не адмовіцца ад антыяпонскіх поглядаў і будзе працягваць аказваць дапамогу Чжан-Сюэ-Ляну і манчжурскім валянтэрам, дык Японія здыме з сябе адказнасьць за пашырэньне ваенных дзеяньняў на ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ.

Цзюменкоў заняты японцамі

ШАНХАЙ. 11—I. «РЭЙТЭР» пацьвярджае заняцьце японцамі горнага праходу Цзюменькоў (у 14 кілёмэтрах на поўнач ад Шанхай Гуаня). «Рэйтэр» паведамляе побач з гэтым, што прадстаўнік Хо-Джу-Го (кітайскі камандуючы гарнізонам у Шанхай-Гуане) меў спатканьне з японскім каманд зірам у Сінь-Вань-Дао. Абмен думак, паводле слоў агенцтва, ня даў ніякіх вынікаў.

Пратэст нанкінскага ўраду

ШАНХАЙ. 12-I. Англійскае і амэрыканскае пасольства ў Кітаі атрымалі пратэст нанкінскага ўраду, адрасаваны дзяржавам падпісаўшым баксэрскі пратакол 1901 году У пратэсьце зазначаецца парушэньне пратаколу Японіяй, выкарыстаўшай Мукдэн Бэйпінскую чыгунку для перакідваньня войска і заняцьця Шанхай-гуаня.

Японія--Ліга Нацый

БЭРЛІН. 12-I. Паводле паведамленьня «ТЭГЛІШЭ РУНДШАЎ» міланскі карэспандэнт агенцтва Тэлвуйнон меў гутарку з японскім дэлегатам у Лізе нацый—МАЦУОКА—аб падзеях на Далёкім Усходзе і адносінах Японіі да Лігі нацый.

На пытаньне карэспандэнта, ці застанецца Японія ў Лізе, Мацуок сказаў, «адносіны Японіі да Лігі нацый ня зьменяцца да таго часу, пакуль Ліга нацый будзе насіць характар дарадчага гуртка. Але калі Ліга нацый набудзе характар асобнай дзяржавы і пачне выдаваць загады, тады Японія адмовіцца ад удзелу ў ёй».

«Калі вы хочаце міру ў Азіі—зазначыў далей Мацуока,—дык умацоўвайце пазіцыю Японіі, але калі вы хочаце хаосу, які магчыма выкліча сусьветны пажар, тады можаце стаць на бок Кітаю».

Справа работнікаў Белдзяржснабу „Апалітычны нацдэм":

На 8-м дні сваёй работы суд урэшце пераходзіць да допыту падсудных Таўкача. У ходзе судовага сьледзьтва выявілася многа фактаў злачынной дзейнасьці Таўкача. Падсудны гэта добра ведае і таму так расплыўчата пабудована яго шасьцігадзінная прамова.

Неэтычныя паводзіны Таўкача ў адносінах да суда і нашых савецкіх установаў выклікаюць абурэньне працоўных гораду Менску, якія зьявіліся на працэс. Старшыня суда т. Рэвінскі прымушаны некалькі разоў стрымоўваць і ўрэшце катэгарычна папярэдзіць падсуднага.

Замест шчырага прызнаньня Таўкач ужывае тактыку гаварыць і наварыць бязупынна, сваю шкодніцкую дзейнасьць узвальваць на іншых, спасылацца і казыраць прозьвішчам раду адказных работнікаў і ўстаноў.

Таўкач пачынае сваю прамову з апісаньня свайго жыцьця. Тлумачыць атрымлае вышэйшую камэрцыйную адукацыю, палітыка яго зусім не цікавіць.

— Лютаўскую рэвалюцыю я і мае «аднакашнікі» сустрэлі здавальняючэ. Я супроць гэтага нічога ня меў, бо яна (рэвалюцыя) мне не перашкаджала,—адказвае Таўкач на запытаньні старшыні суда аб яго адносінах да рэвалюцыйных падзей у 1917 годзе.

У 22-х гадовым узросьце Таўкач уступае ў Адэскую Беларускую раду і лічыць гэта «памылкай юнацкіх гадоў».

Таўкач хоча давесьці суду, што ўступаючы ў рады нацдэмаў ён усё-ж застаецца «апалітычным». Нават «апалітычным» і тады. калі зьяўляецца сакратаром рады, а пасьля сакратаром консульства ў Адэсе. Але гэтыя довады толькі пераконваюць суд і ўсіх прысутных, што гэта ня проста злачынца, а вораг, які хаваючыся пад маскай апалітычнасьці хоча захаваць свой сапраўдны твар заўзятага шкодніка, двурушніка, як ўспрымаў рэвалюцыйныя падзеі, толькі таму, што яны яму «не перашкаджалі».

Уся «апалітычнасьць» Таўкача разьбіваецца аб зусім вядомыя факты контррэвалюцыйнай дзейнасьці Беларускай рады ў Адэсе, якая займалася адпраўкай дэмабілізаваных салдат і афіцэраў на Беларусь для арганізацыі «сваёй беларускай арміі» супроць Савецкай улады.

Таўкач сам кажа, што мэтай рады было не дапускаць арганізацыі БССР у складзе ўсяго Савецкага Саюзу, што рада з пункту погляду рэвалюцыйнай сытуацыі была варожай у адносінах да пралетарскай рэвалюцыі. Рада падтрымлівала цесную сувязь з контррэвалюцыйнай гетманшчынай на Украіне, якая дапамагала грамадзе ў яе варожай нам дзейнасьці.

Факты аб якіх кажа Таўкач «пра памылку юнацкіх гадоў» і факты, якія выявіла следзтва разьбіваюць усю «апалітычнасьць» Таўкача, за якою ён хаваўся.

Калі коўзк «апалітычнасьці» быў ужо выбіты з рук Таўкача ён пачынае выкручвацца «разыходжаньнямі» ў палітычных поглядах між ім і лідэрамі беларускай рады,—нацдэмамі Баніцкім, Некрашэвічам, Адамовічам і інш.

Ён хоча давесьці, што лічыўся «не надзейным чалавекам сярод нацдэмаў таму парваў з імі ўсякую сувязь, а разам з гэтым і контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай работай. Але... «парваўшы сувязь» Таўкач усё-ж паступае на работу ў якасьці сакратара консульства так званай Беларускай Народнай рады, консулам якой быў «ворагі» Таўкача—Некрашэвіч. «Парваўшы сувязь» з нацдэмамі, Таўкач усё-ж пры іх дапамозе пераязджае ў 1924 годзе ў Менск і пры іх дапамозе пралазіць на кіруючыя пасады ў нашы савецкія рэспубліканскія ўстановы. У гэтым яму дапамагаюць тыя-ж самыя яго «ворагі» нацдэмы Баніцкі і інш.

Такім чынам і другі фокус Таўкача —«палітычныя разыходжаньні» разьбіты судовым сьледзтвам. Таўкач быў актыўным ворагам савецкай улады з пачатку рэвалюцыі, таксім ён застаўся і цяпер.

Таму ня дзіва, што ўся работа яго ў адзай з важнейшых рэспубліканскіх устаноў у Белдзяржснабе была цесна ўвязана з яго палітычнымі поглядамі і ўся злачынная дзейнасьць яго—гэта нішто іншае, як сьвядомае шкодніцтва, што і пацьвердзіла ў сваіх выступленьнях экспэртная камісія.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 г. дня

Ад 5 сту зеня нямецкі маст. фільм

ГОРНАЯ БАЛЯДА

Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно

Ад Дзяржаўнага Вучонага Савету

ДЗЯРЖАЎНЫ ВУЧОНЫ САВЕТ

папярэджвае

кіраўнікоў ВНУ, ВТНУ і нав.-дасьледчых устаноў, якія павінны былі прадставіць сьпісы навуковых працаўнікоў у кваліфікацыйную камісію ДВС, згодна пастановы, зьмешчанай у газэце «Зьвязда» № 240 і гэтага не зрабілі, што ў выпадку неатрыманьня адпаведных сьпісаў да 20 студзеня 19 3 году, яны будуць прыцягнуты да адказнасьці

Вучоны сакратар ДВС ЧМЯЛЕЎСКІ

Шклоўскі вячэрні рабфак з 8 па 20 студзеня

ўтварае набор студэнтаў

на 4 курс дзеннага рабфаку.

Прымаюцца асобы, скончыўшыя 8 кл. II ступені, або маючыя адпаведную асьвету.

Студэнты будуць поўнасьцю забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заняткі пачнуцца 25 студзеня 1933 г. Дакуманты прымаюцца толькі ў арыгіналах і згодна правіл паступленьня ў рабфакі і ВНУ.

Нам. заг. Шклоўскага вячэрняга рабфаку П. САМАХВАЛАЎ.

На падставе пастановы Калегіі Народнага камісарыяту зьвязёвых і жыцёлгадоўчых саўгасаў Саюзу ССР за № 128 ад 23-XII 1932 г. і пастановы СНК БССР за № 11 ад 4 I 19 3 г.

Першы ўсесаюзны дзяржаўны трэст па б. даўніцтве ў агр маджаным сэктары сельскай гаспадаркі „Першы Саюзсельбудтрэст"

(был. Белсельбуд) яго будаўнічыя вучасткі і гаспадарча-разьліковыя канторы

з 1 студзеня л квідуюцца

Асобы і установы, якія маюць прэтэнзіі да Першага Саюзсельбудтрэсту, павінны прадставіць аб гэтым Ліквідкамісіі гор. Менск, Савецкая, 70, да 25 студзеня 1933 г.

ліквідком

Менскі гаражны заг в кікае гр. ЛУКШЫЦА Уладзіміра Іосіфава на 13 лютага 1933 г. а 9-й гадзіне раніцы па справе скасаваньня шлюбу з гр. Лукшыц Алесяй Іванаваў.

Згублена круглая пячатка з надпісам: „Групком сталоўкі і буфету ТПО саюзу грамадзкага харчаваньня. Лічыць страціўшай моц

Згублена дамавая кніга жаку № 65 па Нова-Маскоўскай вул., № 9. Лічыць страціўшай моц

Згублена дамавая кніга жаку № 9 па Галяварэйным зав. Лічыць страціўшай моц

Членскі білет, выд. саюзам мэталіст ў на імя Шафэр С. Я., кв. 1072.

Асабовае пасьведчаньне, выд. заводам «Полымя рэволюцыі» на імя Храпоўскай М. А., кв. 881.

Пасьведчаньне аб скончаньні першай перасоўчай школы ЦСПСБ на імя Аленовіч, кв. 882.

Асабовае пасьведчаньне, выд. канторай МББ на імя Ігрэзо Ф. М., кв. 883.

Пашпарт, выд. 2-м аддзяленьнем міліцыі на імя Сальнікаў А. М., кв. 884

Пашпарт выд 2-м аддзяленьнем міліцыі на імя Сальнікава М. А., кв. 885

Даведка аб скончаньні МШУ на імя Пуванкевіч І. С., кв. 886.

Студэнцкае пасьв., выд. аўта-дарожным рабфакам на імя Багдановіч Я. Я., кв. 887.

Асабовае пасьведчаньне, выд. Транспартным трэстам на імя Ламака А. А., кв. 888.

Пасьведчаньне аб скончаньні 7-годкі на імя Златаў П. С., кв. 889.

Асабовае пасьведчаньне, выд. Кіеўскім акр. на імя Лушенка Я. Я., кв. 890.

Пасьведчаньне аб скончаньні 4-х груп на імя Варанай В. К., кв 891.

Пашпарт, выд. Менскім 1 адд. міліцыі на імя Урбановіч Н. С., кв. 893.

Мэтрычны білет, выд Менскім аддзелам на імя Юхноўскі Д. П., кв. 655

Заводакіраўніцтва яшчэ не адчувае сябе гаспадаром прадпрыемстваў былога ЗРК

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Запалкавая фабрыка «Пралетарская перамога»—адно з двух прадпрыемстваў БССР, дзе, згодна пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б), ЗРК ліквідуецца і справа забясьпечаньня цалкам пераходзіць у веданьне заводакіраўніцтва. Мэта перабудовы даволі выразна відаць ў першых-жа словах пастановы. «Далейшае палепшаньне арганізацыі забясьпечаньня рабочых»—такая асноўная мэта перабудовы. На фабрыцы «Пралетарская перамога» падыйшлі да гэтага пытаньня вельмі фармальна. На сходах рабочых кіраўнікі фабрыкі, зразумела, не шкадавалі слоў. Згодна прафсаюзнай статыстыкі, пытаньню аб перабудове забясьпечаньня было прысьвечана 36 групавых сходаў, 18 цэхавых, 10 агульна-заводзкіх (!) і 3 лятучых мітынгі. Такім чынам, нагаварылі шмат. А калі спрадайшла да практычнай работы, дык не хапіла пораху. Увесь порах выдаткавалі на слоўны фэйэрэрк.

Прыёмку маемасьці ЗРК заводакіраўніцтва скончыла 26 сьнежня. Да гэтага-ж часу быў назначаны намесьнік дырэктара па рабочым забясьпечаньні—былы загадчык забясьпечаньня фабрыкі—Сьвярдлінскі. З правіла, якое рэкамэндуе пастанова ЦК аб назначэньні на пост нам. дырэктара былога старшыню ЗРК, заводакіраўніцтва зна йшло патрэбным зрабіць выключэньне. Былы старшыня ЗРК назначаны загадчыкам гандлёвым аддзелам. Але гэтая акалічнасьць яшчэ не настолькі важная. Важней за ўсё тое, што заводакіраўніцтва, выканаўшы гэтыя два мерапрыемствы, на ўсё астатняе махнула рукой.

Якія задачы стаяць перад заводакіраўніцтвам у першыя-ж дні пасьля перабудовы? Асноўная задача, як мы ўжо ўказвалі—палепшаньне забясьпечаньня рабочых. Па гэтым пытаньні дырэктар фабрыкі тав. Ізакаў дае вычарпальную і шчырую даведку:

— Палепшаньне забясьпечаньня рабочыя яшчэ не адчуваюць...

Чаму?—Ды таму, што тав. Ізакаў ня стукнуў палец аб палец у гэтым напрамку. Фабрыка, якая налічвае 2600 асноўных рабочых, мае загатоўчы апарат у 2 чал. Столькі-ж было і раней, у часы дзейнасьці ЗРК. Заводакіраўніцтвам да гэтага часу ня можа зразумець, што асноўнай крыніцай забясьпечаньня—да стварэньня моцнай улас най харчовай базы, павінны быць самазагатоўкі. Наадварот, за апошні час самазагатоўкі значна паслаблі. У выніку, сталоўка апынулася з 2-х тыднёвым запасам бульбы і на працягу апошняга месяца варыць выключна яшчынныя абеды. Невялікая колькасьць мяса, што трапляе ў сталоўку, выдаткоўваецца на прыгатаваньне 200 абедаў па, так званай, павышанай цане—1 руб. 75 кап. абед. Вось гэта і ёсьць уся «паблюдная сыстэма», якой так га варацца кіраўнікі сталоўкі. У канцы лістапада кіраўнікі сталоўкі абяцалі падпішыць якасьць абедаў. На гэтай падставе яны з 1-га сьнежня «авансам» павялічылі кошт стандартнага абеда з 35 да 50 кап. Але абяцаньне застало ся пустым гукам і падбаўка на абед па сёнешні дзень выклікае правільныя папрокі рабочых.

Другая важнейшая задача перабудовы забясьпечаньня—барацьба «з разлачай фондаў харчовых і прамысловых тавараў фактычна не працуючым на прадпрыемствах прагульшчыкам і лятунам» (з пас. ЦК і СНК).

З гэтай задачай заводакіраўніцтва пакуль што спраўляецца дрэнна. Перарэгістрацыя рабочых пачата 7-га сьнежня і да сёнешняга дня ня скончана. З 2600 рабочых—каля 1000 перарэгістрацыі яшчэ не прайшлі. Перарэгістрацыя праводзіцца апаратам быў. ЗРК пры назначнай дапамозе загадчыкаў цэхамі. Стол пайнікаў замест таго, каб спусьціцца ўніз, у брыгады, узьняць сабе ў дапамогу актыў, абмежаваўся абвесткай аб перарэгістрацыі і чакае рабочых да сябе.

Выдача наборных дакумантаў пачата толькі 3-га студзеня ў каробачным цэху. Пры выдачы картак стол пайнікаў патрабуе толькі паявыя кніжкі, спасылаючыся на праверку ў часе перарэгістрацыі. Але спачатку перарэгістрацыі прайшоў амаль месяц, могуць быць зьмены як у складзе рабочых, так і ў складзе іх сем'яў. Гэты момант ня ўлічваецца.

Табельшчыкі не падрыхтаваны. У 5-х цэхох (з пяці) табэльшчыкаў зусім няма. Рабочыя да магазынаў не прымацаваны. Апрача труднасьцяй у кантролі, гэтая акалічнасьць стварае чарги, бо ў адных магазынах заўсёды пе запоўнена, у другіх-жа амаль пуста там застаюцца лішкі тавараў.

Толькі 4-га студзеня выданы загад аб кантролі над выдачай прадуктаў. Згодна загаду, табельшчыкі павінны ставіць адзнакі ў хлебных кніжках кожны дзень. Такі парадак абяцае вялікую нагрузку табельшчыкам і лішнюю цяганіну ў тых выпадках, калі рабочы ня выходзіць на работу спраўды па важнай прычыне (хвароба ці інш.).

Па гэтым шляху пайшоў ужо дырэктар фанэрнага заводу (частка камбінату «Пралетарская перамога») Розэнбэрг, які распарадзіўся не даваць выходным рабочым абедаеных талёнаў. Два дні выходныя рабочыя, асабліва адзіночкі, заставаліся без абедаў.

У той-жа час прагульшчыкі і лятуны, як і раней, маюць магчымасьць жыць на заводзкіх хлябох (бо загад яшчэ не праведзены ў жыцьцё!). Так, у сьнежні адабралі наборныя дакументы ў 28 прагульшчыкаў, але фактычна звольненых значна больш. На ўсе загадчыкі цэхамі паведамляюць аб прагульшчыках і лятунах. Без падрыхтаваных табельшчыкаў або зусім без табельшчыкаў цэхі ня маюць магчымасьці паставіць правільны ўлік рабочых. Па гэтай-жа прычыне яшчэ не ўстаноўлена колькасьць працуючых на фабрыцы, хоць ужо выдалена 310 «мертвых душ»; якія нічога агульнага ня маюць з фабрыкай, у тым ліку «ліпавых утрыманцаў» 50 чал.

Аддзел рабочага забясьпечаньня яшчэ ня мае пляну работы на далейшае, ня ведае што яму рабіць, з чаго пачаць? Між тым, час не чакае, вяс ня не за гарамі. Якія пэрспэктывы фабрычнага каапгасу—ніхто ня ведае. Паўтара месяцы таму назад бюро партыі, абмежаваўся абвесткай аб перарэгістрацыі і чакае рабочых да сябе.

Выдача наборных дакумантаў пачата толькі 3-га студзеня ў каробачным цэху. Пры выдачы картак стол пайнікаў патрабуе толькі паявыя кніжкі, спасылаючыся на праверку ў часе перарэгістрацыі. Але спачатку перарэгістрацыі прайшоў амаль месяц, могуць быць зьмены як у складзе рабочых, так і ў складзе іх сем'яў. Гэты момант ня ўлічваецца.

Табельшчыкі не падрыхтаваны. У 5-х цэхох (з пяці) табэльшчыкаў зусім няма. Рабочыя да магазынаў не прымацаваны. Апрача труднасьцяй у кантролі, гэтая акалічнасьць стварае чаргі